Незабудкі з Нурца-Станцыі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

За сваю мову ☞ 5

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2842) Год LV | Беласток, 31 кастрычніка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

ЦАГЛІНКА НА ЛЕПШЫ ФЕСТЫВАЛЬ

— У таямніцы скажу, што хацелі ў гэтым годзе наладзіць адзін з канцэртаў у Шчытах, *— сказаў Міхась Сцепанюк, старшыня Звязу беларускай моладзі, арганізатар XVII Фестывалю „Бардаўская восень”,* **— але, як відаць па праграме, яшчэ год трэба пачакаць.**

Надзея Артымовіч і Алег Кабзар супольна з сябрамі запрэзентавалі паэтычна-музычны праект „Бераг”.

„Co się odwlecze to nie uciecze” — гаворыць польская прымаўка і, здаецца, рацыя ў тым, каб не спяшацца, толькі паказаць усе арганізатарскія таленты ў адпаведні момант. Таму сёлета „Бардаўская восень”, хаця як заўсёды вабіла кранальнай праграмай, ахвяравала цудоўны настрой і зацікаўленне публікі да прэзентаванай музыкі, магла падацца такой пераходнай, на крок да... Звяз беларускай моладзі ўсе свае сілы аддае зараз Цэнтру адукацыі і прамоцыі беларускай культуры ў Шчытах, таму сёлетнім „Бардам” бракавала адчування стабільнасці і ўпэўненасці. Але я ўпэўнена, што якраз дзякуючы семнаццатаму выпуску праз год, калі фестываль стане дарослым, напэўна набудзе новы характар ды пры дапамозе публікі, якая ахвотна набывала дабрачынныя цаглінкі на цэнтр у Шчытах, гукі „Бардаўскай восені” паплывуць з новай якасцю. Але! Усё гэта не абазначае, што сёлетні фестываль быў слабейшы за папярэднія. Хто паяўляўся на канцэртах ці слухаў трансляцыі на Радыё Рацыя ведае, што ўражанні можна мець ад фестывалю адны і тыя ж самыя. Мёд на сэрца!

У „Бардаўскай восені” заўсёды мяне захапляе атмасфера, якая існуе на зусім розных узроўнях, асабліва сярод канкурсантаў. Калі сядзіш на канцэртах у Бельскім доме культуры і захапляешся цудоўнымі песнямі, часам нябачна і пазяхаеш, не ўяўляеш сабе, што дзесьці ў іншых памяшканнях варыцца кроў у другім кровазвароце. Хвалююцца тыя, якія чакаюць свайго выступу, а глыбока дыхаюць тыя, якія сцэну ўжо паспелі наведаць. У гэтым годзе атмасфера конкурсу была ўвогуле асаблівая. Не толькі па прычыне высокай якасці выканаўцаў, але перш за ўсё таму, што двух на трох сяброў журы ацэньвала выканаўцаў на аснове таго, што пачулі па радыё. Узровень эмоцый напэўна павысіўся таксама канкурсантам з гурту „Скрыжалі”, якія былі пасажырамі машыны журы і таксама не паспявалі ў Бельск-Падляшскі. У напружанасці сітуацыі арганізатары вырашыліся са зменамі і пакуль пачаўся конкурс, ужо паспелі выступіць адны з зорак, гурт „Relikt”, мінулагодні лаўрэат Гран-пры фестывалю. Эмоцыі раслі па ўсіх баках сцэны, але нягледзячы на гэта, у гардэробе поўныя нерваў маладыя барды свой стрэс перакавалі ў прыемнасць. Большасць конкурсных салістаў аказалася фалькларыстамі ці этнографамі, таму спалучылі свае сілы і спявалі народныя, беларускія песні. Спявалі так і ў пятніцу, і ў суботу, але ж конкурс мусіў вырашыцца. Найбольш паспяховым стаў для маладога этнографа родам са Слоніма. Яўген Барышнікаў захапіў шчырым перажываннем, добрай музычный падрыхтоўкай і напэўна сваёй кранальнай песняй пра Дзяды. Лаўрэат атрымаў гітару і грашовы прыз. Фінансава таксама сваю сітуацыю палепшылі два беларускія гурты, якія безумоўна выклікалі перш за ўсё ў публікі пазітыўны настрой. Першым быў „Інфра-чырвоны выдых”, другім — наваполацкая „Індра”. Журы пароўну падзяліла між іх узнагароды Бельскай беларускай суполкі і Звязу беларускай моладзі. Сапраўды — гэта справядлівы падзел, бо тут якраз паміж эксперыментальным падыходам да бардаўскай творчасці ў выкананні хлопцаў з гурту „Інфра-чырвоны выдых”, а традыцыйным, але шчырым і захапляльным выступам „Індры” свабодна можна паставіць знак роўнасці.

Яўген Барышнікаў захапіў сваёй кранальнай песняй пра Дзяды.

Хаця ў конкурсе падляшскіх выканаўцаў заўсёды нашмат менш, то журы ніколі іх сваёй увагай не абмінае. Тут напэўна выбар лягчэйшы, бо наогул няма іх больш за двух. Так сталася і сёлета. Пётр Петручук і гурт „Бетон” гэта зусім іншыя вагавыя катэгорыі, перш за ўсё ў музычным плане, таму напэўна ўзнагарода бельскага старасты павандравала ў рукі „Бетону”. За ахвоту і музычнае ўяўленне віншую „Бетон”! Непакоіць аднак факт, што ніхто не пракаментаваў выступу мясцовых беларусаў у кантэксце мовы выканання. Разумею, што мы ўзаемна сябе не крытыкуем, бо нас мала, бо зараз хтосьці можа адкіне мову або перастане вучыцца і г.д., але ж бардаўскі конкурс гэта змаганне за прызнанне лепшага ў галіне прыгажосці не толькі музыкі, але перш за ўсё слова. Ігнараванне гэтага павін-

працяг ☞2

9 770546 196000

Бляск і беднасць

Каму ў Беларусі жыць добра? Перыфразуючы гэтае някрасаўскае рытарычне пытанне, гатовых адказаў не маю. Ці добра жыць тым, хто нахапаў, накраў маёмасці і грошай, але штоноч прачынаецца ў халодным поце і ўздрыгвае пры кожным невядомым тэлефанаванні? Ці добра пачуваюцца тыя дзяржаўныя чыноўнікі, якія цудоўна ўсведамляюць, што ўлада ў дзяржаве ўзурпавана, што ніхто іх нікуды не выбіраў, што парадак у краіне забяспечваецца толькі сілай, адміністрацыйным прымусам і падманам? І пры тым разумеюць, што іх „залатая пара" неўзабаве скончыцца, прыйдзе іншая палітычная сітуацыя. З іншага боку, ці добра жыць тым, хто няўпэўнены, што заўтра яму падоўжаць працоўны кантракт, што будзе чым заплаціць за кватэру і накарміць дзяцей? Улада на беларускай зямлі аддалена ад народа як Месяц ад Зямлі. Амаль кожны дзень ад розных знаёмых даводзіцца чуць пра парадкі ў той ці іншай сацыяльнай установе — як амаль не кормяць у дзіцячым шпіталі, ці якія нясмачныя стравы даюць у радзільні. Людзі расказваюць, што іх хатнія жывёлы лепей харчуюцца. На мінулым тыдні давялося зайсці ў прыбіральню ў адной з вясковых школ Гродзеншчыны. Там было досыць чыста, але ніякай зручнасці і камфорту — старыя ўнітазы без накрывак, яшчэ савецкая плітка, драўляныя касыя перагародкі. Менавіта ў такіх школах мы вучыліся чвэрць стагоддзя таму. Нічога ў іх не змянілася з савецкіх часоў, толькі дзяцей паменела ў некалькі разоў ды слаі фарбы ядавітага колеру павялічыліся. І ў якасці кантрасту — зайдзіце ў дзяржаўную ўстанову — суд, пракуратуру, падаткавую інспекцыю, пра розныя ўпраўленні і выканкамы ўжо не кажу. Чым важней установа — тым больш шыку і раскошы. Усё літаральна зіхаціць, зроблена з дарагіх матэрыялаў. Гэта на Захадзе, прыкладам, у Нямеччыне, чым вышэйшыя ўладныя кабінеты — тым сціплей інтэр'ер. У нас усё наадварот — „слугі народа" павінны пачувацца ў бляску і, як цяпер кажуць, „у шакаладзе". Многія з іх сапраўды вераць, што яны абраная каста, вяршыцелі людскіх лёсаў. І на наведнікаў гыркаюць, зусім ужо ў сабачую скуру ўшыліся.

Дзіўная рэч, але мацуюць такую ўладу якраз найбольш бедныя. Тыя, у каго забралі ўсё яшчэ з дзяцінства — права на волю, на ўласнасць, на годную працу і высокі заробак. Яны зайздросцяць свайму бліжняму, такому як яны, за кожны лішні рубель ці маленькі поспех. Але не хочуць нават думаць, што такое, прыкладам, Прэзідэнцкі фонд, адкуль ён узяўся, з чаго складаецца? Сённяшняга кіраўніка Беларусі падтрымліваюць менавіта найбольш бедныя слаі насельніцтва — вяскоўцы, пенсіянеры, службоўцы ніжэйшага роўню. І гэты парадокс можна зразумець. Гэтыя людзі прывыклі жыць менавіта так, яны не маюць мыслення і ўсведамлення, што можа быць неяк па-іншаму. Гарантыі мінімальнага сацыяльнага забеспячэння ім надзвычай дарагія, многія яшчэ памятаюць разгубленасць і непаслядоўнасць улады на пачатку дзевяностых, адразу пасля развалу СССР. Ніхто з іх не хацеў і не хоча разбірацца чаму тады было так складана, хто быў у тым вінаваты. Ім трэба, каб ім давалі нешта зверху, яны не разумеюць, што яны самі зарабілі не толькі тое, што ім даюць але і ўдвая, ўтрая, у дзесяць разоў болей. Пераважнае мысленне савецкага чалавека — як і на чым ашчадзіць, адкласці, зэканоміць. Ён не можа думаць, што трэба больш зарабляць, што формула „чым лепш працуеш — тым больш маеш" дзейсная ў іншых краінах.

Другі „кіт" матэрыяльнага дабрабыту — як, дзе і што ўкрасці. Дзяржава неафіцыйна дазволіла красці — „всё вокруг колхозное, всё вокруг моё". Вось і цягнуць усё, што можна цягнуць, але да пэўнай мяжы, якую дзяржава пільнуе і не дасць перакрочыць. А прыйдзе час — і за каласок пасадзяць, як гэта было пры Сталіне! Бо што дазволена быку, не дазволена індыку. Самую дарагую цану за крадзеж звычайна плацяць менавіта бедныя. Іх няма каму абараніць, няма каму „адмазаць" перад „самым гуманным судом".

А тым часам крот гісторыі капае і летапіс чалавечых учынкаў ідзе сваім парадкам...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

За шклом

Апошнім часам са сваіх акраін у цэнтр Беластока стаў я хадзіць пяшком. Гэта і фізкультурна, і экалагічна, і эканамічна — не толькі ашчаджаючы на білетах, але нават і на часе. Бо ж цяпер усялякі транспарт па некаторых беластоцкіх вуліцах валочыцца крайне няспешна па прычыне іх грунтоўнай перабудовы і празмернай колькасці самаходаў. Ды не толькі, бо выступае тут і адна недамернасць.

Хаця часта хаджу па Беластоку на сваіх дваіх, аднак часікам карыстаюся і гарадскімі аўтобусамі. Вось так аднойчы з па-чарапашаму прасоўваючагася забітай вуліцай аўтобуса глянуў я навонкі яго. А там такімі ж тэмпамі „гналіся" легкавушкі. А ў тых легкавушках ехалі амаль выключна самі шафёры — мо толькі ў кожнай больш-менш дзесятай былі пасажыры. Значыць, у машынах ездзяць у прынцыпе адно „сінглі", якія ў разлічаных на стандартную сям'ю легкавых самаходах перавозяць з аднаго месца Беластока ў іншае адно паветра, выручаючы такім чынам закладзенага прыродай паветрагона — вецер, ды розныя яго абумоўленасці кшталту цыклонаў ці антыцыклонаў. Да таго ж трэба дадаць, што пешаход ці пасажыр аўтобуса займае каля аднаго квадратнага метра вулічнай плошчы, а адзінокі вадзіцель са сваім самаходам ды дыстанцыяй перад і за машынай займае таго месца ў дваццаць разоў больш. І так закліноўваюцца тыя нашы беластоцкія вуліцы.

Неўзабаве пасля гэтага назірання сустрэў я знаёмую, якой не бачыў мо з пяць гадоў, а якая жыве па суседняй ад мяне вуліцы і каля жылблока, дзе я хаджу амаль штодзённа. На маё пытанне ці не памяняла яна адрасу, адказала, што жыве там увесь час і пры нагодзе патлумачыла ейную рэлятыўную незаўважальнасць. Сказала яна, што з кватэры перамяшчаецца ў самаход і самаходам на працу. І так жа вяртаецца, заключаючы сваё бытаванне ў какон кватэра-самаход-праца-самаход-кватэра. Для парадку дадам, што яна з'яўляецца згаданым ужо раней сінглем. І для далейшага парадку дадам яшчэ, што працуе яна за камп'ютарам і можна дадумвацца, што сваё жыццё праводзіць за шклом: на працы, ў самаходзе ды і дома, мабыць, таксама перад яе зрокам тэлебачанне або інтэрнэт.

Такому зашклёнаму чалавеку, як мне здаецца, складана рассінглявацца. Бо ж ён па сутнасці не кантактуецца з іншым жывым чалавекам. Калі б — дапусцім — гэтая мая знаёмая не сядзела на працы за экранам, а, напрыклад, працавала жывой прадаўшчыцай у краме ці барменкай у забягалаўцы і прадавала нейкае піва, то ж яе той іншы чалавек пабачыў бы, і ад піва спадабалася б яна яму як казачная прынцэса, і ад таго ж піва набраў бы ён адвагі казачнага рыцара, і загаварыў бы, і падчапіў бы, і гэтак далей. Паветравозаў было б на нашых вуліцах менш!

Дэмографы трывожацца з прычыны невялікага натуральнага прыросту ў нашым грамадстве. А яно, тое наша грамадства ў пагоні за выгодным жыццём дагнала яго і застыла ў сваіх фатэлях. Людзі сталі цяпер выдумваць сабе розныя сурагаты руху, якія б мелі вярнуць чалавека да закладзенай прыродай актыўнасці, да руху. Бо ж рух прыцягвае ўвагу... Ці можа прыцягнуць увагу адарванай ад камп'ютара асобы нейкая постаць застылая за абведзенай шклом кіраўніцай? Гэта не тое, што калісь, калі бачылася ўсю жывучасць іншага чалавека, усю гібкасць, сілу, далікатнасць, прыгажосць, чалавека ва ўсіх яго прыцягальных ракурсах. Не толькі ў паходцы ці танцы, але і за жнівом, за церніцай, за растрасаннем гною, за плугам, з песняй. Бяда была, калі хто не быў заўважаны. Цяпер і паходку, і ўсялякі іншы рух, і нават акно ў свет забралі ад чалавека машыны — забралі ад яго іншага чалавека, загналі яго ў шкляную клетку.

Ці трэба трывожыцца такой перспектывай? Крыху трэба, але не поўнасцю. Бо ж у прыроду закладзены механізм, які заўважыў калісь Ньютан, шырэй вядомы пад назвай трэцяга прынцыпу дынамікі. На кожную акцыю з'яўляецца рэакцыя, людзі заўважаюць адмоўнае і на свой лад выпраўляюць скрыўленні. Не хацелася мне траціць часу на чарапашую язду аўтобусам — пайшоў пяшком.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

1 ☞ працяг на выклікаць сорам, а не гонар. Уражанні ад конкурсу засталіся ўсё ж такі пазітыўныя, бо, цытуючы Міхала Анемпадыстава, сябра журы, „яго ўзровень зноў павысіўся".

Заўсёды шмат хочацца расказаць пра паасобныя выступы, бо ў іх свая гісторыя, але варта ўспомніць „Босае сонца", якое памяняла свой музычны выгляд, узмацніла гучанне, хаця, паводле ацэнкі тых, якія бачылі абодва сёлетнія выступы ў Бельску і Гайнаўцы, усё ж такі больш прыемна слухалася ў Гайнаўцы, калі было больш лірыкі папярэдняга складу — менш інструментальнай энергетыкі, а больш далікатных гукаў гітары і голасу Алеся Зайцава. Сваёй публікі не падвёў таксама Зміцер Вайцюшкевіч і „WZ Orkiestra", хаця на гэты раз без скрыпкі, то з адданасцю і вернасцю сваёй стылістыцы. Не быў гэта можа самы лепшы выступ гэтага гурту, затое выдатна паказаў на што ставілі націск сёлетнія выступоўцы. Прозвішча Уладзіміра Караткевіча, якому сёлета споўнілася б 80 гадоў, вярталася на сцэну як бумеранг, а Зміцер Вайцюшкевіч прадставіў амаль поўную праграму на яго словы. Аднак зачараваў публіку вялікім зорным сэрцам, якім пусціў вока да свайго сябра, паэта Уладзіміра Някляева.

Зміцер Вайцюшкевіч і „WZ Orkiestra"

Свой моцны акцэнт паставілі сёлета таксама выканаўцы з Падляшша. Фестываль адкрыў Тамаш Суліма сваімі новымі эксперыментальнымі па гучанні творамі. Высокую ацэнку паставіла таксама публіка беластоцкаму „Ilo&friends". Вельмі цешыць, што гэты выступ віншавалі такія бардаўскія зоркі як Тацяна Беланогая ці Лявон Вольскі. А фестывальную рэпрэзентацыю беларусаў Падляшша ўзмоцніў яшчэ канцэрт паэзіі праекта „Бераг". Надзея Артымовіч і Алег Кабзар супольна з сябрамі прэзентавалі тое, што іх спалучыла на вечнасць: любоў да музыкі і паэзіі. Мы ўжо прывыклі да песень Алега Кабзара на словы Надзеі Артымовіч, але поўны выраз знайшло гэта якраз сёлета, супольна з чытаннямі паэтэсы, на сцэнах Беластоцкага лялечнага тэатра і Бельскага дома культуры, у які будзем паломнічаць ужо праз год.

Так важная для правядзення сёлетняга конкурсу трансляцыя фестывалю „Бардаўская восень" у прамым эфіры Радыё Рацыя магла здзейсніцца дзякуючы фірме Multimedia Polska S.A.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

„У маі нарадзіліся, не забываем сваіх каранёў"

„НЕЗАБУДКІ" З НУРЦА-СТАНЦЫІ

У Нурэцкай гміне з амаль пяці тысяч жыхароў беларусамі запісалася 13,36% насельніцтва. Паводле лікаў мужчын тут больш чым жанчын, а лясы займаюць палову зямлі. Пачынаецца яна сто кіламетраў на поўдзень ад Беластока, а сталіца гміны распаложана ў 20 кіламетрах ад павятовага горада. „Забываеце пра нас, беларусаў з Сямятыччыны!" — папракаў нас неаднойчы Язэп Карпюк з Сямятыч, паэт, аўтар найбольш вядомы ва ўсёй краіне песняй „Журавы". І ён яшчэ раз завязе мяне ў нядзелю 17 кастрычніка, у вятрысты і халодны дзень, калі не ходзяць аўтобусы па вёсках, — у Нурэц-Станцыю. А спачатку — у Жэрчычы, непадалёк Залесся. А было падобна ў сонечны май 2008 года, калі ён падкінуў мяне на сваім чырвоненькім фіаціку на сустрэчу. Іншым разам моцна свяціла жнівеньскае сонца ці разгуляўся праліўны дождж. Гэта было ў Машчонай-Панскай, куды на свята вёскі прыехалі госці не толькі з Нурэцкай гміны. А гэта якраз **яны** прывезлі сонца: незабудачкі-цётачкі, якія адважыліся паспрачацца за сваё ў гмінным доме культуры ў Нурцы-Станцыі і выступіць як самастойны ансамбль са свойскімі песнямі. Праўда, не трэба было ім спрачацца з Ірэнай Яношук, якая заўжды іх падтрымае. У нурэцкім доме культуры раней збіраўся вялікі калектыў, у большасці пенсіянерскі. „Тэнча", значыць, „Вясёлка". Ім даспадобы былі патрыятычныя песні. А гэтыя сталі „Незабудкамі", якіх выпадкова ўдалося... мне ахрысціць у Машчонай-Панскай, калі мы першы раз спаткаліся. Потым прадзіралася я да іх, у Жэрчычы, праз гурбы снегу, сягаючыя амаль да вярха аўтобусных акон. Да Надзеі Карчэўскай, родам з Рагачоў. Надзея ўжо больш за дванаццаць гадоў жыве ў Жэрчычах. І горнуцца да яе людзі, не толькі праваслаўныя. Выступае яшчэ з імі Марыся Шпанская, яе дачка (як кажа Сцяпан Копа: „як гожы альт!"), з Нурца-Станцыі, і жанчыны з блізкага Залесся — Оля Філоц, каталічка Галіна Пытэль, Ніна Якімюк, і з Забалоцця — Антаніна Грушэўская. І былая настаўніца Ніна Цімашук, і Валя Грыцюк. А на гармоніку падыгрываць стаў ім Антон Капэлька з Радзівілаўкі, гарманіст і спявак капэлы „Рэтра". Іграюць тое, што ў душы ім іграе — песні беларускія, паляшуцкія, рускія, а і польскія. Гэтак, як усе нашы людзі, тыя песні ў іх — свае. Не забываюцца. А тыя „Незабудкі" — якраз ад таго. Надзея Карчэўская сказала тады, у летні дзень у праваслаўнай вёсцы сем кіламетраў ад Сямятыч: „Мы не забываем і не забудзем". „Дык вы — «Незубудкі»"! — мабыць невыпадкова ахрысціла іх я гэтым імем. І выступілі яны ў гонар усяе Нурэцкае гміны, а на цэнтральным аглядзе фестывалю „Беларуская песня — 2010" пачуліся авацыі: „Жыве Нурэц!". Надзею Карчэўскую слухачы ведалі і раней — выступала яна салісткай, ад Сямятыцкага павета.

— Даў мне на старасць Бог лепшае здароўе, добрую памяць і крыху талентаў. Нельга ж закопваць сваіх умеласцей і магчымасцей у зямлю. Рашыла я паварушыцца, — усміхаецца Надзея. — Захацелася мне знайсці падобных мне. Села на ровар і паехала ў Залессе, да Ніны Якімюк. І рушыліся мы ўсе разам, пры падтрымцы Ірэны Яношук. Дзякуем і вам — тады вы і „Ніва" паддалі нам духу! І мы ахвотна сталі выступаць. Спачатку ў сваёй гміне, у павеце, а пасля і далей. Паехалі мы ў Нараўку — узялі трэцюю ўзнагароду. А на фестывалі беларускай песні нас вылучылі. Выступаем і на аглядах калядак, і на экуменічных мерапрыемствах сакральнай песні. Думалі паказацца і ў Аглядзе фрывольнай песні ў Чорнай-Беластоцкай у ліпені, але якраз у нас было свята. Ведаем і вясёлыя песні, не толькі адно пра тугу пяем... Вельмі рады былі выступіць першы раз на „Сяброўскай бяседзе", праспявалі, а і першае месца ўзяў наш каравай!

Афіцыйны „хрэст" калектыву „Незабудкі" адбыўся аж у перадзім'е 2010 года. Урачыста, з рукі войта Нурэцкай гміны Пятра Яшчука, у гімнастычнай зале школы. З букетамі кветак, з падарункамі (між іншым Сцяпана Копы), з канцэртам сяброў — нурэцкай „Тэнчы", вілінаўскіх „Верасоў", „Навіны" з Машчонай-Каралеўскай, капэлы „Рэтра", паэтак з Сямятыцкага літаратурнага клуба.

Надзея Карчэўская, Ніна Цімашук, Валя Грыцюк, Оля Філоц, Антаніна Грушэўская, Марыя Шпанская, Галіна Пытэль — гэта яны! Іх блакітныя атласавыя блузкі ззяюць навізною, ды песні ў іх свойскія, старыя. І новую маюць: вось сёння Язэп Карпюк падарыў ім сваю, жартаўліва-філасофскую, але ж народную, „Па дарозе выбаістай". Як у жыцці, таксама і іхнім: „По дорозі выбоістой, по дорозі, там Біда з Добрынёю ехалі на возі. Ехалі, ехалі, почалі ойкаты: дэ ж бы тут одпочыты, крыху погуляты?". „Жыве Нурэц!" — узнімалі тосты і за „Незабудкі" і іх пачын, а келіхі напаўняў сам войт!

УВАГА КОНКУРС

XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **15 лістапада 2010 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2010 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Аліна ЛЕАНЕЎСКАЯ

Я стаю...

Ужо соты раз
стаю перад люстрам
і пытаюся: хто я?
Кім я ёсць,
чаго хачу ад жыцця?
Чаму ўсё блытала
свае сцежкі, замест ісці
стаптаным гасцінцам?

* * *

Не саромлюся
аднак
сябе самой
і свае маладосці.
І маіх вачэй,
сягаючых неба,
і маіх вушэй,
што чуюць шэпт зямлі
і майго сэрца,
што шукае чалавека.

Дакажы, што ты стары

Мая жонка ў верасні атрымала ад Пошты польскай, з „Цэнтра фінансавай абслугі, цэнтральнага асяродка аплат, аддзялення ператварання дакументаў у Беластоку, вул. Варшаўская 11", паведамленне, што ад 1 красавіка 2010 года павінна пастаянна аплачваць абанемент на радыё і тэлебачанне, бо калі не аплаціць яго ад таго часу, дык яны налічаць іх з працэнтамі. Хіба што данясе ім дакументы, што яна звольнена з аплат, але спачатку мусіць напісаць прашэнне ў Краёвую раду радыёвяшчання і тэлебачання. На маю думку, што калі ёсць дзяржаўны закон аб тым, што асоба пасля 75 года жыцця звольнена ад аплат за абанемент, а чыноўнікі, якія маюць даныя ўсіх абанементаплацельшчыкаў, маюць таксама і іх даты нараджэння, дык маглі б падзівіцца, што ёй 77 гадоў і яна па закону звольнена з гэтых аплат. Столькі там на пошце тых цэнтраў і аддзяленняў, столькі чыноўнікаў, дык што — толькі там каўку папіваюць? А старыя людзі мусяць ім даказваць свой узрост? Напісаў я прашэнне ў Краёвую раду радыёвяшчання, выбраўся і я са сваіх Бялкоў з дакументамі на вул. Варшаўскую ў Беласток, бо жонка нядужая...

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Звярына на дарозе

14 кастрычніка перад 13-ай гадзінай на дарозе Гайнаўка — Нарва дайшло да сутыкнення аўтамабіля са звярынай. Нечакана пад колы „вольва" выбег дзік. Шафёр не паспеў спыніць машыну. Дзік загінуў. Пяць гадзін пазней, на адвячорку, на дарозе Новаберазова — Койлы пад кола „мерседэса" папала дзікая каза. І гэтым разам звярына не мела шанцу выратавацца. Да чарговага здарэння дайшло 15 кастрычніка перад сёмай зранку. На дарозе Дубіны — Навасады пад машыну хуткай дапамогі нечакана выскачыў дзік. Звярына загінула. На шчасце ва ўсіх гэтых здарэннях не пацярпелі людзі, адно былі пашкоджаны машыны.

Паколькі да падобных здарэнняў можа дайсці ў любы момант, дык паліцыя заклікае шафёраў да разважлівай язды. Дарожныя аварыі з удзелам звярыны здараюцца ў асноўным на скрыжаваннях дарог, калі раніцай звярына падаецца ў пошуках корму, або ў пазнейшых пасляабедніх гадзінах.

(ус)

Гайнаўка

Выстаўка рысункаў Юркі Жукоўскага

Зараз у Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы можна агледзець выстаўку рысункаў гайнавяніна Юркі Жукоўскага. Ён удзельнічае ў Аглядах непрафесійнага мастацтва Гайнаўшчыны і заваёўвае першыя месцы. Сваімі рысункамі Жукоўскі запісвае месцы на Беласточчыне, якія адыходзяць. Рысуе старыя будынкі крытыя саломай, драўляныя вясковыя царкоўкі, дубы-волаты, узлескі Белавежскай пушчы, маляўнічыя закуткі ў вёсках над Нарвай і Нараўкай. На выстаўцы каля дзвюх дзесяткаў карцін. Бібліятэка запрашае на выстаўку ў гадзінах свае працы. **(яц)**

Адны радуюцца, а другія баяцца

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Збудаванае за вялікія грошы і паводле сучасных тэхналогій прадпрыемства ў агульным радуе гайнавян, але не вырашае цэлага працэсу перапрацоўкі адходаў

Пасля ўрачыстага адкрыцця, якое адбылося 1 кастрычніка, у Гайнаўцы пачало працаваць Прадпрыемства па перапрацоўцы адходаў, збудаванае побач даўняй звалкі смецця. Распачаліся таксама першыя работы на акраіне горада ў напрамку вёскі Хітрая, дзе мае быць звалка несартавальных прасаваных адходаў. Аднак гарадскім уладам так і не ўдалося супакоіць скептыкаў новай інвестыцыі. Асабліва жыхары вуліц Вжасовай і суседніх баяцца, што адходы, якія астануцца пасля сартавання смецця і маюць складвацца на былых Гурнянскіх лугах, могуць забруджваць акружаючую прыроду і шкодзіць здароўю людзей. Пішуць яны новыя пратэсты з патрабаваннем спыніць будову звалкі непрыдатных для рэцыклінгу адходаў.

З працай Прадпрыемства па перапрацоўцы адходаў маглі пазнаёміцца шматлікія госці, сярод якіх былі святары, самаўрадаўцы і прадстаўнікі шматлікіх устаноў. Нават улады суседніх паветаў маюць намер наладзіць супрацоўніцтва з гайнаўскай суполкай, каб давозіць сюды свае адходы для сартавання. Хаця ў агульным гайнавяне задаволеныя збудаваным паводле сучасных тэхналогій прадпрыемствам, то частка жыхароў Гайнаўкі апасаецца менавіта адходаў з суседніх рэгіёнаў. Гарадскія радныя пыталі раней на сесіях пра лёс прывезеных здалёк і непрыдатных для сартавання адходаў. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк тлумачыў, што на сартаванні адходаў гайнаўскае прадпрыемства можа заўважальна зарабляць, а непрыдатнае для сартавання смецце будзе вяртацца ў тыя гміны, з якіх прывозілі б яго ў Гайнаўку. Аднак паяўляліся сумненні, дзе прыватная суполка, якая арганізуе гаспадарку адходамі ў нейкай гміне, будзе складваць прасаванае смецце пасля сартавання, калі ў гэтай гміне або нават у цэлым суседнім павеце не будзе звалкі прыстасаванай для складвання несартавальных адходаў, якія маглі б ляжаць там доўгі час, і калі такая звалка будзе ў Гайнаўцы.

— Мы ставім свае ўмовы супрацоўніцтва самаўрадам, якія хацелі б прывозіць у Гайнаўку адходы для сартавання. Будуць яны мусілі забіраць да сябе тое, што астанецца ад сартавання, — заявіў бурмістр Анатоль Ахрыцюк.

Улады Гайнаўкі хочуць вярнуць хаця б частку сродкаў з 6 млн. зл., якія з пазык і гарадскога бюджэту былі выдаткаваны на рэалізацыю інвестыцыі. 8 млн. зл. Гайнаўка атрымала ў якасці дапамогі перш за ўсё з еўрасаюзнага бюджэту пры падтрымцы Экафонду.

Прадбачваецца, што ў новаадчыненым Прадпрыемстве па перапрацоўцы адходаў будзе працаваць нават каля 20 чалавек. Будуць яны сартаваць нават да 12,5 тысяч тон смецця ў год. Жыхарам гайнаўскай вуліцы Парыева і іншых кароценькіх вулак, распаложаных побач сартавальні, цяжка зараз адназначна ацаніць новую інвестыцыю, паколькі людзі яшчэ не звыкліся да канца верыць абяцанням улад. Спадзяюцца яны, што ў новым прадпрыемстве хутка будзе перасартаванае смецце з вялікіх старых звалак, якія амаль абапіраюцца аб велізарны мадэрны будынак, бо такое абяцанне далі мясцовым жыхарам гайнаўскія ўлады. Якраз вадкія адходы са старэйшых звалак найхутчэй маглі пранікнуць у глебу і далей у водныя цёкі. Раней жыхары навакольных дамоў моцна наракалі таксама на разнастайныя паразітаў, якіх можна было сустрэць на панадворках. Хаця мясцовыя не апасаюцца дзейнасці сартавальні ў вялікім будынку, бо яна трывала аддзелена ад акружаючага асяроддзя, то да канца няўпэўненыя, ці нейкія несартавальныя адходы не будуць складвацца таксама побач сартавальні, бо не захочуць іх мець жыхары з іншага боку Гайнаўкі.

Адзін з галоўных аргументаў удзельнікаў пратэсту супраць звалкі канчатковых адходаў на Гурнянскіх лугах, гэта адносна невялікая адлегласць паміж планаванай звалкай і птушыным запаведнікам на тых жа лугах. Аднак адлегласць паміж новай інвестыцыяй і людскімі сядзібамі настолькі вялікая, што цяжка будзе ім пераканаць адпаведныя ўстановы аб пагрозе непасрэднай шкоднасці звалкі для людзей. Інвестыцыю можна будзе абгарадзіць і забяспечыць ад пастаронніх людзей і звярыны, якая магла б прыйсці на звалку з Белавежскай пушчы. Аднак цяжка будзе неадкладна забяспечыць несартавальныя адходы ад птушак, прынамсі ў час іх складвання, бо некаторыя з птушак ахвотна прызямляюцца якраз на тых месцах, дзе зроблена нешта новае. Канчатковыя адходы маюць прысыпацца зямлёй, што таксама будзе прывабным для птушак. Хаця якраз гэтыя аргументы могуць паказацца многім гайнавянам малаістотнымі, а нават смешнымі, то могуць мець заўважальнае значэнне, напрыклад, у Міністэрстве асяроддзя. Вядзецца таксама гаворка пра пацукоў, якія могуць завесціся на звалцы, а пасля пранікаць у людскія сядзібы.

— Гурнянскія лугі — цудоўнае месца для адпачынку. Знаходзяцца там птушыны запаведнік, адукацыйная сцяжынка і навошта нам нішчыць гэта, — заявіла ўдзельніца пратэсту.

Аднак прадстаўнікі гарадскіх улад паведамляюць, што там ад 25 гадоў было месца адведзенае на звалку смецця. Звалка несартавальных адходаў, збудаваная паводле сучасных патрабаванняў, намнога больш бяспечная для акружаючага асяроддзя чым звычайная звалка.

Калі ў Гайнаўцы рэальныя формы набыла ідэя ўзвядзення прадпрыемства, у якім сартаваліся б адходы, былі планы будовы прынамсі для Бельскага, Сямятыцкага і Гайнаўскага паветаў вялікай звалкі несартавальных адходаў побач Дубяжына Бельскай гміны. Аднак жыхары гэтага сяла сталі пратэставаць і намеры будовы звалкі і сартавальні былі спынены. Удзельнікі пратэсту ў Гайнаўцы не вераць гарадскім уладам і апасаюцца, што гайнаўская звалка можа стаць месцам складвання несартавальных адходаў для трох згаданых паветаў, прынамсі да часу будовы падобнай у іншым месцы.

Распачаліся ўжо першыя работы на Гурнянскіх лугах, каб прыстасаваць тэрыторыю да большых будаўнічых прац. Гэта выклікае яшчэ большае абурэнне ў людзей, якія нядаўна пасяліліся на акраіне прыпушчанскіх лугоў, збудавалі дамы.

— Нават у рапарце ўздзеяння новай інвестыцыі на акружаючае асяроддзе гаворыцца, што час ад часу на Гурнянскіх лугах паяўляецца вада і гэта абазначае, што пад паверхняй зямлі знаходзяцца грунтавыя воды. Да гэтай пары не праводзіўся дакладны аналіз уздзеяння новай інвестыцыі на грунтавыя воды і на чысціню рэчкі Хвішчэй, што плыве побач Гайнаўкі, — заявіла Малгажата Болбат, удзельніца пратэсту. Лічыць яна, што згодна з указаннямі міністра асяроддзя нават адходаў непасрэдна няшкодных для асяроддзя нельга складваць на багністых і падмоклых участках, а такімі паводле ўдзельнікаў пратэсту з'яўляецца частка Гурнянскіх лугоў. Абскарджваючы пастанову аб згодзе на будову звалкі несартавальных адходаў, удзельнікі пратэсту чакаюць рашэння Міністэрства асяроддзя ў іх справе. Аднак што будзе, калі яны выйграюць і нельга будзе будаваць звалкі на Гурнянскіх лугах? Дзе тады можна будзе складваць несартавальныя адходы са смецціперапрацоўчага прадпрыемства? Жыхары вуліцы Парыева і суседзі Прадпрыемства па перапрацоўцы адходаў хутчэй за ўсё таксама будуць пратэставаць супраць будовы непасрэдна каля сартавальнага прадпрыемства і недалёка ад іх дамоў вялікай звалкі канчатковых адходаў. На працягу дзесяцігоддзяў яны ўжо дастаткова нанюхаліся таго паху, што разыходзіўся ад старых звалак смецця. А гарадскія ўлады абяцалі, што каля іх хат напэўна не будуць будаваць новай звалкі. Іншых месц на будову новай звалкі ў Гайнаўцы няма, а калі б такія ўдалося выдзеліць, пэўна таксама паявяцца пратэсты супраць новай інвестыцыі, так як было ў Дубяжыне. Хутка будуць самаўрадавыя выбары і хутчэй за ўсё канчаткова будуць вырашаць гэтую справу новаабраныя гарадскія ўлады. Можа рашацца яны вазіць несартавальныя адходы з Гайнаўкі ў нейкі завод для спальвання смецця?

Мара захаваць сваю мову!



Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Пазмагацца за будучыню мовы можна і на... ровары! Брэтонец Эмануіл ле Мерлю (Emmanuel le Merlus) сеў на веласіпед і рушыў у бок нацменаў Еўропы. Дзеля здзяйснення свайго праекта інжынер-будаўнік па прафесіі ўзяў гадавы водпуск. З роднай Брэтані выехаў ранняй вясной, дакладна 15 мая г.г. У канцы верасня, ужо з багатым досведам і восеньскай прастудай завітаў у нашу рэдакцыю, каб расказаць пра сваё турнэ. Раней наведаў дзесяткі школ і арганізацый ды ў кожнай кропцы сфатаграфаўся на фоне брэтонскага бел-чорнага сцяга, распавёў аб праблемах сваёй радзімы. Аказалася, што ў падарожжа падштурхнула яго мара захаваць родную мову.

— Хачу, каб брэтонцы размаўлялі па-брэтонску, — сказаў наш госць.

Паколькі асноўную ролю ў захаванні мовы і тоеснасці ў цэлым свеце вырашае асвета, ключ падарожжа Эмануіла ле Мерлю складаюць візіты ў школах і адукацыйных установах ды грамадскіх суполках. (Сярод спонсараў ягонага праекта апынулася аб'яднанне бацькоў навучэнцаў брэтонскай мовы). Брэтонцы — гістарычная кельцкая меншасць, якая насяляе паўночна-заходні рэгіён Францыі — Брэтань. Мы, беларусы, маем шмат супольнага з гэтым старажытным народам. Сярод іх нацыянальных страў сустракаем бліны з мясам і сырамі ды печыва з цёмнай і белай мукі. У іх этнічнай музыцы, падобна як у нас, асноўнае месца займае дуда. Урэшце брэтонцы маюць свой Брэст — адзін з буйнейшых гарадоў рэгіёна. Апрача прыведзеных паралеляў брэтонцы таксама змагаюцца за захаванне сваёй мовы. На сённяшні дзень 15 тысяч дзяцей і моладзі вывучае брэтонскую мову на ўсіх узроўнях: ад садка па факультэт на ўніверсітэце. Частка школ мае двухмоўны французка-брэтонскі характар. Хоць па беларуска-падляшскіх мерках (у нас нацыянальную мову ў якасці дадатковага прадмета вывучае толькі 3,5 тысячы вучняў) прыведзеныя лічбы ўяўляюць сілу і перспектывы, самі брэтонцы свядомыя пагрозы свайго знікнення.

— Сто гадоў таму па-брэтонску размаўляла мільён асоб, — адзначае наш госць, — а зараз ёю карыстаецца ўжо дзвесце тысяч.

У сваім змаганні за мову брэтонцы найперш разлічваюць на саміх сябе і на падтрымку кельцкіх народаў Ірландыі і Вялікабрытаніі. У гэтай справе найбольш можна павучыцца ў валійцаў, якія найбольш з кельцкіх народаў развінулі і распаўсюдзілі ў грамадстве мову. Падарожжа Эмануіла ле Мерлю пачалося менавіта з сустрэчы з кельтамі Валіі, Ірландыі, жыхарамі выспы Мэн (мова манкс) і Шатландыі. Далейшы адрэзак турнэ ідзе праз Нідэрланды з візітам у фрызаў, пасля іх наведаў датчан ў Шлезвіг-Гальштэйне, немцаў у Даніі ды фінскую меншасць у сталіцы Швецыі. Адтуль павярнуў у Польшчу да кашубаў, каб пасля зноў вярнуцца ў Швецыю да фінскай меншасці. У Фінляндыі брэтонскі падарожнік сустрэўся са шведамі, у Эстоніі — з расейцамі, пасля з латгаламі ў паўднёвай Латвіі і з караімамі ды палякамі ў Літве. Перад візітам у Беласток падарожнік наведаў польскіх літоўцаў у Сейнах. У Беластоку сустрэўся з Янам Сычэўскім з БГКТ і з дзеткамі ды настаўнікамі ў польска-беларускім садку. (Фатаграфіі ды запіскі ад сустрэч можна пабачыць на блогу http//europa-tour-over-blog.com).

Пасля Беластока чакала яго яшчэ дарога праз Славакію, Нямеччыну, Францыю, Аўстрыю, Румынію, Балгарыю, Грэцыю, Італію, Іспанію з прыпынкамі ў многіх нацыянальных меншасцяў. У канцы дарогі Эмануіл ле Мерлю наведае Брусель, каб перадаць рапарт з дарогі еўрасаюзнаму камісару. Пра што будзе дакладваць?

— Пра тое, што Еўропа гэта не толькі англійская мова, што гэта дзесяткі жывых моў і дыялектаў, якія змагаюцца за захаванне і развіццё.

Наш беластоцка-беларускі свет незразумелы чалавеку з захаду Еўропы. Сярод апублікаваных на сайце фатаграфій з падарожжа пабачым „двухмоўе" на Беласточчыне. Карацей, яго прадстаўляюць камерцыйныя рэкламы на польскай і рускай мовах. Падазрона выглядае таксама польская меншасць у Літве ў беларускіх нацыянальных касцюмах! Вядома, каб падобныя кветкі не манілі вачэй людзям звонку, мы самі павінны прыбраць свой нацыянальны агародчык.

Было на старонках

Гартаючы свае сшыткі з вершамі, якія, мабыць, не ўбачаць белага свету, стаў я сумотна раздумваць аб тым, што калі адыду на вечны спачын, хтосьці, калі будзе парадкаваць па мне з жонкай Соняй нашу хату, калі іх знойдзе, дык пэўна выкіне іх проста ў смецце ці спаліць. Але калі я так гартаўся ў маіх паперах, знайшоў здымак са з'езду карэспандэнтаў з лютага 1977 года. Тады карэспандэнтам 1976 года быў Мікалай Няплоха. Гэта той здымак карэспандэнцкай сямейкі на лесвіцы на першы паверх таго будынка, дзе калісь працавала „Ніва" — па вуліцы Весялоўскага 1, цяпер Сураскай. Другі здымак з таго з'езду падпісаны: *У рады карэспандэнтаў прыйшло маладое пакаленне.* На гэтым здымку добра распазнаю Янку Кірызюка — маладога хлопца, школьніка, які добра валодаў беларускай мовай і быў добрым карэспандэнтам. Янка вельмі часта паяўляўся на старонках „Нівы" з прыгожымі допісамі. Цяпер Янка Кірызюк — Іван і перайшоў ад беларусаў да украінцаў і там займае пачэснае месца ва ўладах Саюза украінцаў Падляшша ды завецца украінскім пісьменнікам.

Другі здымак зроблены ў Бельскім доме культуры, здаецца, на завяршэнні літаратурнага конкурсу, з подпісам: *Галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Мірановіч (злева) з лаўрэатамі конкурсу: Юркам Буйнюком, Мікалаем Лук'янюком, Мікалаем Панфілюком і Ірэнай Лукшай.* Задумаўся я сур'ёзна над гэтымі здымкамі ды сябрамі і сяброўкамі, што на іх. Што з імі здарылася? Ці яны жывуць, бо ж некаторыя не даюць знаку жыцця. А дзе падзеліся тыя карэспандэнты ад Шудзялава, Крынак, Саколкі?.. Ці пе пакінулі яны па сабе дзяцей ці ўнукаў, ці ўтрымаліся ў іх сувязі з „Нівай"? Мне хацелася б даведацца, як маюцца нашы карэспандэнты такія як Валянцін Семянюк з Раек, Грыша Мароз з Беразова, Ірына Лукша (Аўрора) з Гайнаўкі, Мікалай Панфілюк з Дубіч-Царкоўных, Мікалай Краўчук з Беластока, а калісь з Патокі. Тут я пералічыў імёны толькі некаторых карэспандэнтаў, калісьці актыўных. Дарагія, не цурайцеся роднай мовы, пішыце!

Карэспандэнты, і старэйшага пакалення, і крыху маладзейшага, якія не парвалі сувязі з „Нівай" гэта Уладзімір Сідарук з Кузавы, Міхал Мінцэвіч з Орлі, Васіль Петручук з Беластока, Пётр Байко з Белавежы і Жэня Мартынюк з Бельска.

Жадаю ўсім карэспандэнтам добрага здароўя, шчаслівага сямейнага жыцця і поспехаў у сваёй працы.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Міхась Андрасюк умела піша па-польску

Валянціна ЛАЕЎСКАЯ, Радыё Рацыя

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Прэзентацыяй творчасці Міхася Андрасюка і апошняй кнігі, якая выйшла на польскай мове „Вагон другога класа", распачаўся новы цыкл сустрэч у серыі „Пагаворым пра..." у дыскусійным клубе АБ-БА.

На сустрэчу з пісьменнікам 21 кастрычніка ў школе нумар 4 у Беластоку прыйшло каля трох дзясяткаў чалавек, можна смела казаць, прыхільнікаў творчасці Міхася Андрасюка.

Усё пачалося з маленькай прэзентацыі аднаго з апавяданняў пісьменніка пад загалоўкам „Крыжык".

— Я ў захапленні ад Міхася. Можа таму ён нам блізкі, што мы з Беласточчыны? Ён, так бы мовіць, наш хлопец. Гэта цудоўна, што маем такога пісьменніка, якога не трэба перакладаць на польскую мову, а прозу якога могуць пачытаць і тыя, хто не ведае беларускай мовы. Для Міхася характэрна тое, што ён любіць сваіх герояў, — падзялілася ўражаннямі ад сустрэчы Аліна Ваўранюк, настаўніца беларускай мовы.

— Мяне ўражвае мова Міхася Андрасюка: лёгкасць напісання, аптымістычная проза, з гумарам. Ён паказвае звычайнае жыццё Гайнаўкі незвычайна, — адзначыла ўдзельніца сустрэчы Тамара Карнілюк.

— Перадусім, ён вельмі лёгка чытаецца. Гэта тыя кніжкі, да якіх я захачу вярнуцца, — распавяла старшыня аб'яднання АБ-БА Барбара Пякарская.

Сустрэча з пісьменнікам, а таксама рэдакцыйным калегам Радыё Рацыя, Міхасём Андрасюком доўжылася амаль 2 гадзіны. Кніжкі, якія можна было набыць падчас сустрэчы, разышліся як „свежыя булачкі", а прыбытак ад кніжак аўтар аддаў на дзейнасць клуба АБ-БА.

Міхалова

Царква — візітнай картачкай

Міхалоўская царква гэта каштоўны помнік старадаўнасці. Ёй больш за 100 гадоў. Юбілейную сотую гадавіну існавання яна святкавала ў кастрычніку 2008 года. У ёй усе купалы пакрыты пазалочанай бляхай, сцены прыгожа размаляваны.

Гэтая драўляная царква з'яўляецца турыстычным атракцыёнам Міхалова (Беластоцкі павет). У ёй знаходзяцца арыгінальныя іконы, напісаныя выдатным мастаком Адамам Сталёны-Дабжанскім. Падобныя роспісы гэтага мастака былі і ў Праабражэнскай царкве на Грабарцы, але згарэлі разам з храмам падчас пажару. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

ОРЛЯ прыгажэйшая за Афіны!

Сёння меў быць смакавіты ўрок, прысвечаны свойскаму хлебу. Разам з пяцікласнікамі мы сутрэліся ў інфарматычнай зале, каб спачатку паглядзець фільмы пра выпечку хлеба і каравая. На жаль, падвяла тэхніка і мы засяродзіліся на прыемнай размове. Аказалася, што ніхто з дзяцей не каштаваў яшчэ ні каравая, ні вясельнай *гускі*. Затое ўсе пачаставаліся падрыхтаванай настаўніцай ядой: хлебам і свойскай каўбаскай. Спадарыня Марыя Тамчук падрыхтавала шмат прымавак і прыказак звязаных з хлебам. Адна з іх гучала так: *Якая зямля, такі хлеб!*

Для беларусаў слова *хлеб* мае сімвалічнае значэнне. Часта абазначае яно прыбытак у хаце, добры плён, узровень жыцця. Наш *хлеб*, як аказалася, не надта вабны ў Орлі. Амаль усе апытаныя намі вучні хацелі б жыць у Варшаве, або па-за межамі Польшчы. Таксама сярод найлепшых страў арлянцы назвалі кебаб і экзатычныя салаткі.

Марыя Тамчук

— А для мяне Орля — самае прыгожае месца ў свеце, — кажа Соня Вархал. — Я не хачу з'язджаць за мяжу ці ў іншы горад.

У Соні ёсць свой досвед. Дзяўчынка чатыры разы пабывала ў Афінах, дзе працавалі і жылі ейныя бацькі і нарадзіўся малодшы брат Кевін. Аднак Грэцыя — гэта не Орля! Нідзе няма такой прыгожай восені і чароўных песень. Соня любіць, калі бабуля або іх бацюшка звяртаюцца да яе па-свойму. І вельмі любіць урокі беларускай мовы, мастацтва і музыку.

— Мне таксама найпрыгажэйшая беларуская мова, — кажа Сара Лемеш.

Дзяўчынка апавядае пра іх школьны тэатр, які вядзе спадарыня Ала Зінкевіч. У мінулым годзе рыхтавалі спектакль „Як коцік матулю згубіў". П'есу паказалі на тэатральным аглядзе ў Беластоку, там занялі прэстыжнае месца, а Сара атрымала ўзнагароду для лепшай акцёркі. Са спектаклем выступалі пасля перад сваімі малодшымі сябрамі з прадшколля і ў час Беларускага дня ў іх школе.

— Я дэкламую беларускія вершы, — кажа Кася Рагоза.

Нядаўна Кася разам з малодшай сястрой Оляй пабывалі на свяце паэзіі „Паэтычнае трохгалоссе" ў Бельску. Кася з першага класа прымае ўдзел у конкурсе „Роднае слова". Чаму? Проста любіць беларускія кніжкі. Пяцікласнікаў належным чынам ацанілі ў школе.

— Каб узнагародзіць за актыўнасць, мы выбралі іх сярод цэлай школы і даручылі ім гульню ў тэатр, — кажа Марыя Тамчук.

Настаўніца разам з Алай Зінкевіч рыхтавала пастаноўку „Як коцік матулю згубіў". Як бачыце, варта пакаштаваць свой *хлеб*.

Мы, зразумела, спыталі ў пяцікласнікаў ці ведаюць смак свойскага жытняга хлеба:

— Я вельмі люблю свойскі хлеб, — сказаў Дам'ян з Кашалёў.

— Чаму ён такі смачны?

— Яго выпякае мая мама.

Праз момант усе зайздросцім пяцікласніку, сучасныя мамы не ўмеюць пячы хлеба!

ЗОРКА

Максім ТАНК

Хлеб

Аднойчы на кірмаш здалёк
Вандроўнік плёўся ў горад
І наракаў на свой мяшок,
Набіты лустай спорай.

Аж Хлеб не вытрымаў і так
Азваўся: — Што бядуеш?
Зусім не ты мяне, дзівак,
Але цябе нясу я.

— Ну што ж, пабачым, хто — каго! —
Той запярэчыў строга
І з цяжкага мяшка свайго
Хлеб вытрас на дарогу.

І сам пашкандыбаў далей.
Нішто не муліць плечы.
Дзень прамінуў. Ужо ў імгле
Стаў набліжацца вечар.

Настаў і час перакусіць.
Успомніў Хлеб Вандроўнік,
Што недзе, кінуты, ляжыць,
Духмяны і цудоўны!

Прылёг на нейкім дзірване,
Каб адпачыць хоць трошкі,
Але галоднаму і ў сне,
Знаць, сняцца хлеба крошкі.

Цяпер і сам таму не рад.
Не спіцца, не ляжыцца.
Ці не вярнуцца лепш назад
Ды з другам памірыцца?

Устаў Вандроўнік і брыдзе —
Ідзе пад зорным небам
На месца памятнае, дзе
Ён пасварыўся з Хлебам.

О, як ён рад быў зноў, калі
Сваю пабачыў страту!
І Хлебу нізкі, да зямлі
Аддаў паклон, як брату.

Галерэя ЗОРКІ

1. Імя і прозвішча: Сара Лемеш (ПШ у Орлі, пяты клас).
2. Твой любімы прадмет: фізкультура.
3. У жыцці хачу стаць: акцёркай.
4. У сяброў цаню: калі яны ўмеюць захаваць таямніцу, калі гавораць праўду і калі з імі можна пасмяяцца.
5. Не люблю: спяваць.
6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй.
7. Кніжка якая мяне захапіла: „Беларускія казкі".
8. Падабаецца мне музыка: класічная музыка.
9. Твае ўлюбёныя стравы: кебаб, салаткі.
10. Ці ёсць у цябе любімы спосаб на адпачынак? Так, я люблю чытаць кніжкі.
11. Калі дарасту хачу жыць? У Канстанціне. Чаму? Бо там жывуць мая цёця і хросны бацька, якіх я вельмі люблю.

Чаго найбольш у свеце прагнуць дзяўчаты?

(валійская легенда)

Аднойчы кароль Артур папаў у палон да бязлітаснай пачвары. Бестыя дзень і ноч любавалася славутай здабыччу. Яна добра ведала, што разам са смерцю манарха загіне яго каралеўства. Пачвара дала аднак шанц сваёй ахвяры:

— Я дарую табе жыццё, калі адкажаш на маё пытанне, — прапанавала яна каралю.

— Калі ласка, я гатовы пазмагацца, — уцешыўся палонны, — давайце сваё пытанне!

Калі кароль Артур пачуў словы пачвары, ён спачатку акрыяў. Пытанне паказалася яму простым і зразумелым. Аднак хутка ўцяміў, што знайсці правільны адказ цяжэй, чым перамагчы лютае войска. Як жа гучала тое славутае пытанне, ад якога залежаў лёс караля і яго каралеўства? А вось як звычайна: *Чаго найбольш у свеце прагнуць дзяўчаты?* Кароль думаў дзень і ноч, аднак ніякі адказ не задаволіў пачвару. Некалькі хвілін перад смерцю наведала яго агідная, старая чараўніца — сятра пачвары. Яна прапанавала каралю непрыстойную здзелку:

— Калі які малады рыцар захоча мяне пакахаць і ўзяць замуж, я падкажу табе адказ!

З дапамогай любімаму каралю паспяшыў самы прыгожы і храбры рыцар Ланселот. Каб ратаваць караля Артура, ён даў шлюбную прапанову агіднай чараўніцы. Тая, вядома, аж зарагатала ад радасці. Адвага і шляхетная ахвярнасць маладзёна шакіравала прысутных. Але справы пакаціліся інакш, чым думалі. Пасля таго як Ланселот ўзяў ведзьму за жонку, яна пераўтварылася ў прыгожую маладзенькую прынцэсу. Радасці маладзёна не было канца. У адпаведнасці з дамовай чароўная жонка падказала адказ на пытанне пачвары: *Чаго найбольш у свеце прагнуць дзяўчаты?* Такім чынам вольны кароль Артур разам са сваёй дружынай вярнуўся ў замак Камелот. Ну, а які ж адказ задаволіў пачвару? Сапраўды, ён не такі просты, хоць і такі звычайны. Аказваецца, дзяўчаты найбольш у свеце любяць уладу!

ЗОРКА

Валійцы — старажытны кельцкі народ, які сам сябе называе *камры*, што на іх мове значыць: *свае людзі*. Жывуць яны (2,7 мільёна жыхароў) у гістарычнай краіне Валія (Уэльс), што ў Вялікабрытаніі. З 1999 года маюць яны ўласны парламент і аўтаномію. У Валіі знаходзіцца горад які мае самы доўгі назоў у Вялікабрытаніі і трэці па велічыні ў свеце: Llanfairpwllgwyngyllgogerychwyrndrobwllllantysiliogogogoch (у перакладзе абазначае: касцёл св. Марыі ў даліне, дзе дупло ў белай ляшчыне непадалёк крутога рачнога віру і касцёла св. Тыслё ля чырвонай пячоры).

Вершы Міры ЛУКІ

Клава

Клава іграе на клавішах.
Клава хутка ноты піша.
Ноткі ў вушка залятаюць,
потым у галоўцы йграюць.
Зловіць кончыкам алоўка,
на драўлянай змесціць лоўка,
нотка паміж іншых значкаў
засмяецца ці заплача.
Клава з ноткамі сябруе.
Клава нотак не пільнуе.
Ноччу ноткі ў забаве
заляцяць у вушка Клаве.
Зранку у мелодыі новай
зловіць ноткі на аловак.

Музыка з кайфам

„Босае сонца" ў новых боцінках

Калі гурт „Босае сонца" выступіў упершыню на фестывалі „Бардаўская восень", захапіў усіх. Па-першае, публіку, якая мае права на найбольш эмацыянальныя, суб'ектыўныя ацэнкі. Падругое, журы, якое аб'ектыўна вырашыла прызначыць ім у 2007 годзе адну з узнагарод. З гэтага часу папулярнасць „Босага сонца" расла не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы. Вынікам сталі шматлікія канцэрты, таксама па-за межамі гэтых краін.

Гурт пачынаў з сапраўды сціплага гучання, якое зусім не абазначала сціплай публікі. Тады першапланавай постаццю быў вакаліст і гітарыст Алесь Зайцаў. Падыгрывалі яму іншыя музыкі, але было гэта вельмі камернае. Калі „Босае сонца" атрымала запрашэнне на фестываль „Басовішча", цяжка сабе было ўявіць яго ў такім фармаце і прасторы. Аднак, як кажа Алесь Зайцаў, такія прасторы хочацца здабываць, таму гурт прайшоў перамены. Склад музыкаў пашырыўся, а гучанне стала больш рокавым, хаця зусім рокавай стылістыкай гэтага назваць нельга. Застаецца свая лірыка, своеасаблівы перформенс з памежжа жанраў. Лідар гурту падкрэслівае, што разам з музычнымі зменамі прыйшлі новыя асобы, неабыякавыя. Музыкі „Босага сонца" гэта прафесіяналы, якія рэалізуюць свае музычныя імкненні ў супольным праекце. „У нас бываюць зусім розныя ацэнкі наконт той жа самай музыкі, але якраз у сваім гурце нам лёгка знайсці паразуменне", — дадае Алесь Зайцаў.

Сёлетні выступ „Босага сонца" ў рамках „Бардаўскай восені" напэўна прынёс гледачам новыя ўражанні. Флірт музыкаў з электрычным гучаннем, мацнейшай рытмікай гэта пачатак новай стабілізацыі гэтага гурту. Хто яшчэ сумняваецца ў тым, ці гэта добры напрамак, павінен паглядзець на распаленыя агні ў вачах Алеся Зайцава, калі энергія не дае яму на сцэне спыніцца.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 44

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 40:

Цёця, склад, кладка, акт, толк, но, аброк. Склон, цыкл, латка, рад, вудка, акно, дар, ток.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Рафал Вакулюк** з Арэшкава і **Юстына Марчук** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Журы за працай

Конкурс „Падляшша ў аб'ектыве" — завершаны!!!


І узнагарода — Пётр Свідэрскі

Завяршыўся VI Агульнапольскі фатаграфічны конкурс „Падляшша ў аб'ектыве — 2010", сарганізаваны Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы. 15 кастрычніка былі аб'яўлены пераможцы конкурсу і адбылося адкрыццё конкурснай выставы.

Перамаглі фатографы з Падляшша:
І узнагарода — **Пётр Свідэрскі з Бельска-Падляшскага;**
ІІ узнагарода — **Адам Фалькоўскі з Бельска-Падляшскага;**
ІІІ узнагарода — **Павел Дамброўскі з Элка;**
вылучэнні — **Тамаш Анікіюк з Гайнаўкі, Адам Трахімюк з Белай-Падляшскай і Ежы Войцех Солуб з Беластока.**

Сёлета фатаграфіі ацэньвала журы ў наступным складзе:

— Віктар Волкаў — мастак-фатограф з Супраслі, спецыяліст па фатаграфіі пейзажу і прыроды паўночна-ўсходняй Польшчы;

— Павел Грэсь — беларускі фатограф, выпускнік Інстытута крэатыўнай фатаграфіі ў Апаве (Чэхія), аўтар шматлікіх фатаграфічных праектаў;

— Яраслаў Хыра — фатограф, прыродазнавец, выдавец.

У сёлетнім конкурсе прыняло ўдзел 34 аматараў фатаграфіі, якія даслалі 102 здымкі.

Конкурсную выставу ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы можна наведваць у гадзінах працы ўстановы.

Тамаш ЦІХАНЮК

ІІ узнагарода — Адам Фалькоўскі

Зараз адчуваю сябе свабодным

Інтэрв'ю з ***Анатолем Парэмбскім*** *— беларускім народным паэтам з Валілаў-Станцыі, аўтарам двух зборнікаў паэзіі „Хвалі лёсу" (2008) і „Мы тут былі і будзем" (2010).*

(ч. 2)

Фота Міры ЛУКШЫ

— Спадар Анатоль, а Вашы школьныя ўспаміны.....

— У 1936-1939 гадах беларусам Гарадоччыны было вельмі цяжка жыць. Не было беларускіх школ, толькі польскія. Як хтосьці не ўмеў гаварыць па польску — а з дзяцей ніхто не гаварыў па-польску — то было вельмі-вельмі цяжка такім дзецям. Настаўнікі, трэба сказаць, былі розныя, але большасць з іх мела нядобразычлівы падыход да беларускасці. Я помню дакладна як у 1939 годзе за тое, што я па-польску не гаварыў у сваім дзіцячым асяроддзі, то кожны вялікі перапынак я мусіў стаяць у кутку.

У Мастаўлянах школа была невялікая, затое дзяцей было вельмі многа. У класах было па 50-60 вучняў. Там сядзелі адзін каля аднаго, але якаясь навука была. Найгорш, што гэта была навука па-польску. Нашы беларускія дзеці прыйшлі ў першы клас і ніхто па-польску не ўмеў сказаць аднаго слова. Сярод настаўнікаў былі чыстыя нацыяналісты, напрыклад, Жукоўскі і было цяжка з ім жыць. Былі таксама настаўнікі палякі вельмі сімпатычныя, напр. пані Барташова, якая праўдападобна выводзілася з роду Радзівілаў. Яна вучыла па-польску, бо іншай магчымасці не было, але вельмі добра адносілася да вучняў і да яе ніхто прэтэнзіі не меў. Навука нейк ішла. Памятаю як сёння, што бацюшка і ксёндз вялі рэлігію. Ксёндз склікаў праваслаўных дзяцей, частаваў іх цукеркамі і казаў: „Пшыходзьце до мне на рэлігію". Аднак ніхто з беларускіх дзяцей не ішоў да ксяндза на рэлігію, але былі спробы перацягнуць праваслаўных дзяцей на каталіцызм. У 1938-1939 гадах была моцная агітацыя проціў Расіі, усхвалялі Гітлера. Міністр Герынг прыязджаў у Белавежу на паляванні. Колькі гэта было радасці, што прыехаў нямецкі міністр. Помню яшчэ як настаўнік Жукоўскі цешыўся, што польскі міністр едзе ў Берлін, каб навучыцца як змагацца з камуністамі. У польскім паняцці „камуністы" гэта былі таксама і беларусы. Калі немцы далучылі да Германіі Чэхаславакію, а палякі занялі Заользе, ой колькі гэта было радасці! Пасля гэтага пачалі выпісваць лозунгі: „Dzisiaj Zaolzie — jutro Kijów" („Сёння Заользе — заўтра Кіеў").

— Найбольш мяне цікавіць якой была Ваша маладосць на беларускай вёсцы на Гарадоччыне?

— Жыццё ў вёсцы тады было даволі вясёлае. Моладзі было многа, на вёсках спявалі беларускія песні, хоць польская паліцыя часта перашкаджала іх спяваць, але так многа людзей было цяжка зламаць. Беларускія песні можна было пачуць на кожным кроку: на вуліцы, на полі і дзе хочаш. І таму на беларускай вёсцы было вельмі весела. Было чуваць, што беларуская вёска мае сваю душу, што гэтую душу няма магчымасці зламаць. Яна жыве сваім жыццём. Трэба сказаць тое, што калі беларуская моладзь рабіла забавы, то палякі на гэтыя забавы не хадзілі. Яны збіраліся дзесьці там, хоць іх было вельмі мала, і рабілі сваё. Бывала, што калі паляк з'явіўся на беларускай забаве, то ксёндз за тыдзень або за два на амбоне яго там высмяяў або выкляў за тое, што пайшоў да камуністаў на забаву. Беларуская вёска жыла сваім жыццём, не зважаючы на ніякую нэндзу, бяду, голад, беспрацоўе. Як была якаясьці работа, то толькі для палякаў. Для праваслаўных практычна работы не было, бо на пасады ў дзяржаўных установах іх не прымалі. Адукаваных беларусаў амаль не было.

— Спадар Анатоль, раскажыце як калісьці гуляла беларуская моладзь на музыках?

— Песні ўсе былі беларускія. Іх і зараз спяваюць нашы калектывы „Расспяваны Гарадок" ці „Асенні ліст". Многа іх было, некаторых зараз не чуваць. Спявалася многа рускіх і ўкраінскіх песень. Яны былі асабліва цікавыя ды вясёлыя. Музыкантаў на нашай беларускай вёсцы было многа. У суседняй вёсцы было двух, што самі рабілі скрыпкі. Быў такі Прадчык, што чытаць і пісаць не ўмеў, але скрыпку зрабіць умеў. Пераважна іграліна скрыпках і гармоніках. Такіх як зараз акардэонаў не было, бо не было за што купіць. Іх таксама рабілі самі. Гэтыя музыкі былі асабліва цікавыя. Пакуль не паявілася польская культура, то тут ніякіх абэркаў ці кракавякаў не было. Танцавалі свае полечкі. Гэтыя танцы былі вясёлыя, цікавыя. Наш беларускі народ — народ артыстаў і спевакоў.

— Спадар Анатоль, Вы шмат мелі сяброў у маладосці? Якіх найпрыемней успамінаеце?

— Я меў вельмі добрых сяброў. У дашкольных гадах у мяне былі сябры беларусы-каталікі. Яны былі вельмі сімпатычныя. Праўда, што іх дзеці і ўнукі сталі палякамі і не прызнаюцца, што выводзяцца, напрыклад, з Падазяран ці з Вейкаў. Але калі я ўжо стаў хадзіць у школу, то меў крыху іншых сяброў, але таксама вельмі добрых. Успамінаю Ваньку Бегебу. Гэта быў вельмі сімпатычны хлопец. Бацька яго быў украінцам і крышку пісаў вершы. Я хіба заразіўся ад Бегебы і мы з Ванькам сталі пісаць вершы, якія ў 1940 годзе выслалі ў газету „Піянер Беларусі" ў Мінску. Дасталі мы адказ, што вершы падыходзяць да друку і заахвочвалі нас далей іх пісаць. Ці гэтыя вершы з'явіліся ў друку не ведаю, бо зараз выбухла вайна і мы ўжо ніякіх кантактаў з гэтай рэдакцыяй не мелі. Пачатак вайны быў для нас асабліва трагічны, бо многа людзей з маёй і Ваньчынай сям'і загінула ў першыя дні і нам не было да пісання вершаў. Потым мы яшчэ пісалі, але не было магчымасці іх аддаць у друк. Калі вайна скончылася, Бегеба ў 1945 годзе выехаў на Украіну. Ваня загінуў там у трагічным выпадку. Я яшчэ крышку пісаў і да дзяўчат і аб дзяўчатах. Часам меў я прыкрасці з майго пісання.

— Ці Вы перад вайною атрымлівалі беларускія кніжкі?

— Бацька мой не належаў ні да беларускіх, ні да камуністычных арганізацый. Помню, што нейкая арганізацыя з Гродна ці з Вільні прысылала бацьку кожны год „Беларускі каляндар". І нават прыязджаў нейкі іх чалавек, але я не магу сказаць што гэта Шырма, хаця пра Шырму бацька ўспамінаў. Іншай беларускай літаратуры не помню — толькі беларускія календары былі ў нас. Помню адзін верш:

Пайшла бяда да папа,
Там яе збілі як снапа.
Пайшла бяда рыгаючы,
За сем сажон ступаючы.

Гэты верш быў у беларускім календары можа ў 1938 годзе. Калі прыйшлі саветы, то была беларуская прэса. Я тады хадзіў у беларускую школу ў Мастаўлянах. Усе прадметы былі па-беларуску. Руская мова выкладалася як дадатковы прадмет. Таму я ўмею гаварыць па-беларуску і пісаць, бо каб не школа ў 1940 годзе, то не ведаў бы беларускай літаратурнай мовы. Праўда, мама навучыла мяне пісаць і чытаць, але па-руску. Тады было многа магчымасцей. Хаця некаторыя гавораць, што тады з палітычнага боку не было свабоды, але з культурнага боку беларусы мелі свабоду: спявалі свае песні, сцэнкі прадстаўлялі. Як помню, ніякай дыскрымінацыі ні палякаў, ні беларусаў не было. Мела быць польская школа, бо палякаў тут крыху было. Да гэтага не дайшло, бо вайна выбухла. Як хтосьці кажа, што тут палякаў дыскрымінавалі, дык гэта няпраўда. Былі дыскрымінаваныя толькі тыя, якія хацелі ваяваць з саветамі. А ці беларускае грамадства акцэптавала савецкую ўладу? Напэўна не, бо калгасы нікому не падабаліся, але беларусы цешыліся, што маглі гаварыць і вучыць дзяцей па-свойму. А калі ўжо прыйшла нямецкая акупацыя — сітуацыя змянілася. Дзе-нідзе паявіліся беларускія школы. Праўда, у Мастаўлянах не было. Пачала выходзіць беларуская газета „Новая дарога", якая добра адлюстроўвала гістарычную праўду пра Беларусь і ўсе адносіны на беларускіх землях (...)

Гутарыў Юрка БУЙНЮК

Партызанскі атрад Нікадзіма

Пётр АХРЫМЮК, Варшава

Паходжу з вёскі Ахрымы, якая да 1939 года налічвала трыццаць чатыры гаспадаркі. Жылыя і гаспадарчыя памяшканні былі пабудаваны з драўляных дыляў, амаль усе яны былі крытыя саламянай страхой, а толькі пяць — чарапіцай. Вёска быццам уціснулася ва ўсходнюю акраіну Белавежскай пушчы. Трыстагадовыя, простыя як свечы сосны рваліся ў неба.

Мая бабуля займалася гаданнем сноў і прадказваннем будучыні. Раніцай выходзіла на двор, вярталася дадому і інфармавала, што бор шуміць і гэта абазначае змену надвор'я. Ейныя прагнозы збываліся. Суседзі наведвалі бабулю і расказвалі ёй свае сны, а яна разбірала іх і гаварыла, напрыклад: „Гэта добры сон, будзе ўдалая вестка" альбо „Дрэнны сон, будзе нягода".

Раніцай 22 чэрвеня 1942 года бабулін сын — мой дзядзька Уладзімір расказаў, што ў сне іграў ён на акардэоне, а рэха разыходзілася ва ўсе бакі. Бабуля сказала, што гэта прадвяшчае бяду. У той дзень нямецкае войска арганізавала аблаву на партызанскі атрад Нікадзіма; мой дзядзька быў яго сувязным і ў той жа дзень у даабедні час быў забіты на акраіне пушчы каля спаленай вёскі Бярнацкі Мост.

У жніўні 1939 года па нашай вёсцы кружылі весткі пра надыходзячую вайну з Германіяй. У Ахрымах, у ліку людзей цікавых палітыкі, быў настаўнік Міхал Івацік і іншыя, што за апошні грош падпісваліся на прэсу. У падляшскіх вёсках перад кожнай хатай пры платах уздоўж вуліцы стаялі лаўкі, на якіх сядзелі вяскоўцы, а падпісчыкі чыталі газеты і расказвалі, што адбываецца ў свеце. Гаварылі, што Італія напала на Абісінію і, мабыць, так бедная краіна не ўстоіць перад такой сілай. Настаўнік гаварыў, што Германія не нападзе на Польшчу, бо некалькі дзён раней на паляванні ў Белавежскай пушчы быў вялікі паляўнічы Герынг, блізкі супрацоўнік Гітлера, які гаварыў, што Германія не мае такога намеру і напэўна вайны не будзе: Германія гэта дружалюбная дзяржава і нельга расказваць чутак пра вайну. У Ахрымах толькі солтыс Канстанцін Паўлоўскі меў радыёпрыёмнік з навушнікамі і 1 верасня раніцай Варшава падала камюніке, што гітлераўская Германія без аб'яўлення вайны напала на Польшчу. Дыктар гаварыў: „Польскае войска дае стойкі адпор".

У выніку пакта Рыбентропа-Молатава Польшча была падзелена, а савецка-нямецкая граніца пралягла па рацэ Буг. Тут, каля Сямятыч і Драгічына савецкае войска стала спешна будаваць абарончыя ўмацаванні, агнявыя пункты, аэрадромы. Каля Драгічына стаяла савецкая вайсковая часць з тысячы двухсот салдат, яе камандзірам быў маёр Нікадзім Арлоў (у партызанцы карыстаўся ён такім псеўданімам, сапраўднае прозвішча мне невядомае — аўтар). Перад атакай нямецкіх войск, 22 чэрвеня 1941 года, маёр Арлоў загадаў заняць абаронныя пазіцыі вакол казармаў. Пасля некалькіх беспаспяховых нямецкіх атакаў нямецкае камандаванне загадала ўстанавіць гучнагаварыцель і заклікала абаронцаў здацца, абяцаючы ім ваенны палон паводле Жэнеўскай канвенцыі. Аднак камандзір палка загадаў адкрыць агонь па прыборы і той замоўк. Камандзір не капітуляваў, але загадаў салдатам прарваць акружэнне і прабіцца ў напрамку Белавежскай пушчы. Завязаўся ўпорны бой, салдаты кінуліся ў атаку стралковым ланцугом...

У першай лініі бег лейтэнант Аляксандр Зурын (таксама псеўданім). Калі дабег да нямецкіх пазіцый на адлегласць гранатнага кідка, яго быццам нехта ўхапіў за ногі... Упаў і не можа ўстаць, пачуў як кроў цячэ яму па нагах і руках, зразумеў што здарылася. Ляжаў на плечах і не мог паварушыцца, бачыў як нямецкі салдат падыходзіць да яго, бярэ ягоную вінтоўку, цэліць у ягоныя грудзі, раздаецца стрэл і млее; прытомнасць вернецца да яго толькі ў шпіталі ў Беластоку...

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пастаўленая пры немцах брама перад школай у Старым Ляўкове

Хата Паўлоўскіх у Ахрымах — зараз у ёй вясковая святліца

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Бой даходзіць да рукапашнай схваткі, большасць савецкіх салдат гіне, нямногія трапляюць у нямецкі палон а каля шасцідзесяці салдатам, у тым ліку камандзіру Нікадзіму Арлову, удаецца прарвацца ў пушчу, дзе арганізуюць партызанскі атрад Нікадзіма.

Лейтэнант Зурын, які апрытомнеў у шпіталі, васьмікроць паранены — шэсць прастрэлаў у ногі, адзін у руку і адзін у грудзі — адчуваў сябе вельмі дрэнна. У шпіталі апынуліся таксама лёгка раненыя капітаны Крылоў і Савушкін з ягонага палка. Пасля некалькіх тыдняў лейт. Зурын значна акрыяў, але разам з сябрамі прыкідваўся цяжка хворым. У ходзе лячэння афіцэры спланавалі ўцёкі са шпіталя з дапамогай персаналу і адной ночы на парваных прасцірадлах ссунуліся з трэцяга паверха шпіталя ўніз, дзе іх чакалі партызаны Нікадзіма. Абыдва капітаны адразу далучыліся да партызанскага атрада, а лейт. Зурын прапісаўся сынам у ахрымаўскага солтыса Канстанціна Паўлоўскага; ён і расказаў мне свае ваенныя прыгоды. Але кантакт з атрадам ён трымаў, быў сувязным. Даведаўшыся, што гестапа цікавіцца ім і можа ў любы момант арыштаваць, адразу далучыўся да атрада, які ўжо, у выніку далучэння масцовых мужчын, налічваў звыш 180 чалавек; асаблівае ўзбуйненне атрада — на 80 чалавек — адбылося пасля расстрэлу трынаццаці жыхароў Лукі ў пачатку акупацыі. Мне было тады дванаццаць гадоў і я запомніў, як Зурын расказваў маім аднавяскоўцам пра змаганне атрада з гітлераўцамі.

Атрад Нікадзіма меў у пушчы некалькі зямлянак, адна з іх была ў 17-м квартале Лядскай пушчы. Была яна выкапана ў густым яловым зарасніку, быццам уціснутым у стары лес. Былі там вялікія пянькі ад старых ссечаных елак. У зарасніку партызаны выкапалі даволі вялікую зямлянку, абкладаючы сцены, столь і падлогу драўлянымі дылямі. Пасярэдзіне зямлянкі паставілі цагляную печ, якая была і кухняй, і абагравальнікам. Комін быў выкананы з бляшанай трубы, якая выходзіла праз дупло старога клёна. Старанна замаскаваны ўваход у зямлянку знаходзіўся пад вялікім старым пнём; былі і два аварыйныя выхады.

Атрад Нікадзіма займаўся дыверсійнай дзейнасцю, асабліва ўзрываннем чыгуначных эшалонаў з войскам і тэхнікай для ўсходняга фронту. Чыгуначная лінія з Варшавы праз Седльцы, Ваўкавыск і Ліду ў Вільню на адрэзку ад Пераходаў да Сушчага Барка пралягала цераз Белавежскую пушчу. У Сушчым Барку паблізу чыгункі немцы пабудавалі бункер, у якім кватаравалі яе вартавых, якія фарміравалі патрулі для нагляду за пуцямі. У склад патруля ўваходзіла двух салдат і двух жыхароў суседніх вёсак, вызначаных солтысамі; цывільныя ішлі спераду, а за імі вайскоўцы. Нягледзячы на ахову чыгункі, партызаны ўзрывалі эшалоны, таму нямецкае камандаванне загадала выселіць пушчанскія вёскі. У вёску гестапаўцы прыязджалі на аўтобусах, ачэплівалі вёску, а камандзір загадваў солтысу склікаць жыхароў на сход, дзе паведамлялася пра пацыфікацыю. Кожнаму гаспадару былі вызначаны дзве фурманкі і тры гадзіны на загрузку. Калі абоз выязджаў за вёску, тады гестапаўцы аблівалі будынкі бензінам і падпальвалі; праз некалькі мінут над пушчай узвіваўся слуп дыму і паказвалася полымя. Жыхары маёй вёскі гаварылі, што гітлераўцы палялі Новае і Старое Масева, Старое і Новае Скупава, Бярнацкі Мост і іншыя. У 1942 годзе гітлераўцы загадалі пільнае перасяленне ў Старое і Новае Ляўкова вёсак Ахрымы, Падляўкоўе, Лешукі, Міхнаўка, Церамкі, Лазова, Новіны ды ляўкоўскіх хутароў. Жыхары на працягу двух тыдняў знеслі свае будынкі і перавезлі іх у Старое і Новае Ляўкова — узнікла вёска даўжынёй у пяць кіламетраў.

У школьным будынку ў Старым Ляўкове кватаравала каля сарака нямецкіх салдат, якія мелі змагацца з партызанамі; камандзірам іх быў обер-лейтэнант Фрыц Нэйман, а яго намеснікам фельдфебель Штэтке. Пляц вакол школы абгарадзілі спецыяльным драўляным плотам, у якім з боку вуліцы работнікі пабудавалі ўязную браму з драўляных бярвён, каля якой вартавалі салдаты. Ноччу па вёсцы хадзіў патруль. Патрульнікі, заўважыўшы партызан, прыкідваліся, што іх не бачаць, а партызаны прыкідваліся, што не бачаць патруля. Згодна загаду акупацыйных улад, пасярэдзіне Старога Ляўкова была падвешана паўметровая рэйка і малаток для падавання сігналу трывогі калі б нехта з вяскоўцаў пабачыў партызан.

Аднойчы партызаны прыйшлі за харчамі да ляўкоўскага гаспадара і адыходзячы загадалі, што ў рэйку можа біць па гадзіне пасля іх выхаду з вёскі. Двух партызан схаваліся за кустом каля рэйкі. Гаспадар не чакаў і неўзабаве замахнуўся малатком і ў той момант атрымаў у галаву ўдар прыкладам; пабілі яго так, што тры тыдні праляжаў у шпіталі.

Камандзір атрада вермахта, што стаяў у Старым Ляўкове, высылаў салдат у пушчу ў мэтах сочкі за партызанамі. Бачыў я, як зімою 1943 года чатырнаццаць апранутых у белыя камбінезоны нямецкіх жаўнераў з кулямётамі паехалі на лыжах у Белавежскую пушчу знішчаць партызан. Салдаты з'ехалі ў зараснік на акраіне пушчы, выставілі там пасты, распалілі касцёр, пры якім пеклі каўбаскі і папівалі самагонкай — так выглядала змаганне з партызанамі, так я гэта бачыў.

Гестапаўцы ў змаганні з партызанамі прымянялі розныя метады. Адзін новаляўковец спраўляў сыну вяселле, на якім быў і я. У час вяселля, пры самагонцы, людзі гаварылі пра рознае. Адзін з вясельнікаў быў гестапаўскім шпіком і спецыяльна напраўляў размовы на тэму партызанскага змагання. Гаспадароў сын прызнаўся, што яго дзядзька выконвае ў атрадзе Нікадзіма важную ролю; наступнага дня яго арыштавала гестапа. Нягледзячы на лютыя допыты, юнак не здрадзіў партызан, тлумачачы, што яго расказ быў фантазіяй. Маладога хлопца гестапа паслала ў лагер смерці.

У ліпені 1942 года каля дваццаці гестапаўцаў ачапіла даро-

працяг ☞ 10

9 ☞ працяг

Партызанскі атрад Нікадзіма

Капітаншчына

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

гу з Капітаншчыны ў бок пушчы. Каля другой гадзіны ночы да вёскі наблізілася тройка партызан з атрада Нікадзіма за харчамі. Гестапаўцы адкрылі па іх станковы агонь — двух забілі адразу, трэцяга цяжка ранілі. Забітых гітлераўцы загадалі жыхарам Капітаншчыны павесіць за ногі на вербах — аднаго ў пачатку вёскі, другога ў канцы. А трэцяга, раненага, прычапілі да фурманкі і вазілі па суседніх вёсках з мэтай запалохання іх жыхароў. Павешаных партызан глядзеў я разам з лейтэнантам Зурыным; адным з іх быў капітан Крылоў, быў ён у кальсонах, а на ягоным целе былі сінія сляды ад куль.

Неўзабаве, раніцай, у Капітаншчыну з Беластока прыехаў чорны аўтобус з гестапаўцамі. Яны акружылі вёску і загадалі жыхарам выйсці на вуліцу. Солтыс Паўлоўскі тлумачыў гестапаўцам, што вяскоўцы невіноўныя, што партызаны самавольна забіраюць харчы. Пасля кароткай нарады камандзір гестапаўцаў рашыў, каб яны прагаласавалі ці жыхароў Капітаншчыны расстраляць і вёску спаліць, ці пакінуць жывымі. Большасць гестапаўцаў выказалася супраць расстрэлу. Жыхарам Капітаншчыны загадалі яны забраць асабістыя рэчы і падацца ў Старое Ляўкова, дзе іх рассялілі па гаспадарах; пасля выхаду жыхароў гітлераўцы спалілі Капітаншчыну.

Несумненна, за вяскоўцамі сачыў агент гестапа; мог ім быць стараляўкоўскі солтыс Шпалак. Быў ён немцам па нацыянальнасці і звыш дваццаці гадоў жыў у Старым Ляўкове, быў добрым кавалём, меў двух сыноў і дачку. У той час на работы ў Германію вызначалі маладых людзей. Два кумы Шпалка Алёша Пташынскі і Жэня Рэент сказалі яму: „Ты выслаў на прымусовыя работы ў Германію нашых сыноў, дык вышлі хаця аднаго са сваіх". Шпалак адрэагаваў на гэта хутка: наступнага дня ў вёску прыехалі гестапаўцы з сабакамі, Алёшу і Жэніка вывелі за вёску і там сабакі разарвалі іх. Пасля некалькіх тыдняў Шпалак выехаў у Германію.

У чэрвені 1942 года немцы пачалі вялікую аблаву за атрадам Нікадзіма. Акружылі яны пушчу ад чыгуначнай лініі Нараўка — Гайнаўка да вёскі Рыбакі. Салдаты ішлі з боку Рыбакоў у напрамку Бярнацкага Моста. Па дарозе з Нараўкі ў Крыніцу і на лясных прасеках арганізавалі засады. Гестапаўская разведка мела свайго шпіёна, які даведаўся, што партызаны прабываюць у 17-м квартале пушчы. Немцы сфармавалі стралковы ланцуг і пачалі аблаву, за якою — лятаючы нізка над пушчай — сачыў іхні самалёт „Шторх". Партызаны ад сваіх разведчыкаў даведаліся пра аблаву і занялі замаскаваныя баявыя пазіцыі. Завязаўся бой, у выніку якога загінула па некалькі немцаў і партызан, аднак партызаны вырваліся з акружэння і выйшлі ў пушчу.

Пасля нейкага часу камандаванне атрада вырашыла раскрыць гестапаўскага даносчыка. Разведчыкі атрада пасля некалькіх дзён назіранняў заўважылі, што жыхар Парослага насцярожана ходзіць па партызанскіх слядах; разведчыкі ўхапілі яго. У час допытаў высветлілася, што ён з'яўляецца лесніком. У часе рэвізіі ў яго былі знойдзены зашыфраваныя нататкі. Пабачыўшы доказы, ён прызнаўся ў супрацоўніцтве з гестапа. Партызанскі суд прысудзіў яго да вышэйшай меры пакарання і вырак быў выкананы.

Даведаўшыся пра ліквідацыю свайго мясцовага шпіка, немцы дзеля ліквідацыі атрада прыслалі спрактыкаванага шпіёна, маёра Найбера, які зняў кватэру ў аднаго са стараляўкоўскіх гаспадароў, расказваючы, што ён з'яўляецца савецкім уцекачом з нямецкага палону; назваў ён сябе Мішкам. Хадзіў ён па пушчы з мэтай устанаўлення кантакту з партызанскім атрадам. Праз нейкі час спаткаў пушчанскіх партызан і папрасіў прыняць яго. Камандзір атрада загадаў разведчыкам сачыць за ім. Прыдзялілі яго да адной з партызанскіх груп і пазнаёмілі з запасной зямлянкай. Найбер папрасіў камандзіра адпусціць яго ў Старое Ляўкова, каб расплаціцца з гаспадаром; атрымаў ён дазвол і падаўся ў вёску.

Наступнага дня партызаны, якія ўжо даведаліся пра „Мішку" больш, занялі баявыя пазіцыі на акраіне пушчы. І так як прадбачвалі — у напрамку пушчы набліжаўся атрад нямецкіх салдат з адным цывільным і дзвюма коннымі фурманкамі. Каля чатырохсот метраў ад пушчы салдаты рассыпаліся ў стралковы ланцуг і занялі баявыя пазіцыі. Каля тузіна немцаў сталі набліжацца ў бок лесу і тады партызанскі камандзір даў загад адкрыць агонь. У выніку былі забіты чатыры нямецкія салдаты. Нямецкі камандзір загадаў спыніць наступленне і адступіць. Немцы вярталіся цераз Старое Ляўкова. На фурманках бачыў я выглядаючыя з-пад пакрывалаў боты забітых нямецкіх салдат.

У ліпені 1944 года партызанскі атрад Нікадзіма быў далучаны да Савецкай Арміі. Маёр Арлоў быў назначаны камандзірам часці, а капітан Зурын камандзірам батальёна. У ходзе баёў на фронце капітан Зурын атрымаў дзевятае раненне і быў адведзены з фронту. У канцы 1944 года быў ён назначаны ваенным камендантам горада Гродна (так ён нам пасля заяўляў). Пасля вайны маёр Зурын наведаў Канстанціна Паўлоўскага ў Ахрымах. На сустрэчу прыехаў таксама сын Канстанціна Уладзімір, які ў вайну ў складзе 1 дывізіі імя Касцюшкі камандаваў бронетанкавай ротай, а пасля вайны астаўся ў войску. Жыхары Ахрымоў былі запрошаны на тую ўрачыстую сустрэчу. У іх ліку быў і я.

У гісторыі кожнага народа заўсёды з'яўляюцца постаці, якія самаахвярна рупяцца дзеля яго. Часам яны ўдастойваюцца ўзнагарод і слоў вялікай павагі ад простых людзей і ўлад, а часам за свае ідэі ім прыходзіцца вельмі цярпець, пераносіць гора і беды, і нават прыняць смерць. Пра апошніх, якіх было нямала і ў беларускай гісторыі, распавядаецца на сайце „Пакутнікі Беларусі".

Месціцца сайт-мемарыял у інтэрнэце па адрасе **http://pakutniki.narod.ru.** Выглядае ён даволі проста. Там не сустрэнеш вялікіх аздабленняў, але яго дэмакратычна-адраджэнская накіраванасць бачыцца адразу — уверсе, побач з назвай — герб „Пагоня" і беларускі арнамент.

Даная накіраванасць з'яўляецца своеасаблівым выклікам сённяшняй палітыцы, якую праводзіць беларуская дзяржава на чале з Аляксандрам Лукашэнкам. Калі праўладныя аматары гісторыі распавядуць пра вялікі „ваенны геній" Сталіна, прыводзячы ў якасці прыкладу не так даўно пабудаваную ў Беларусі яго „Лінію", то натхняльнікі сайта, а гэта сябры культурна-асветнага клуба „Спадчына", на шматлікіх прыкладах пакажуць, чым быў „бацька ўсіх народаў" для беларусаў.

„Наш народ на сваім вопыце ведае, што такое сталінскія рэпрэсіі: па розных ацэнках страты беларускага народу складаюць ад сотняў тысяч да мільёнаў беларусаў, — гаворыцца ў тэксце на галоўнай старонцы. — Гэта не проста лічбы, гэта жахлівае сведчанне нялюдскасці рэпрэсіўнага апарату, які быў створаны ў краіне. Успомнім лёс сотняў і тысяч „раскулачаных" беларускіх сялян — дбайных, а таму і заможных гаспадароў. Гэта іх вопыту і ўмення сёння не хапае для пад'ёму сельскай гаспадаркі, якая задыхаецца без гаспадара. Такі ж жорсткі лёс чакаў і маладую беларускую інтэлігенцыю. Расстраляныя па ілжывых даносах і сфабрыкаваных справах сотні навукоўцаў, пісьменнікаў, мастакоў былі гонарам і залатым фондам нашай нацыі! Цяжка ўявіць, які б тытанічны ўнёсак у нацыянальную навуку і культуру яны маглі б зрабіць".

Абапал галоўнага тэксту месцяцца імёны і прозвішчы тых, каго сябры „Спадчыны" называюць пакутнікамі. Кожнаму з пералічаных на сайце імён аддадзена асобная старонка, а каб выйсці на яе дастаткова „клікнуць" на адпаведнае імя.

Варта адзначыць, што імён на сайце даволі многа, але, зразумела, гэта спіс не ўсіх рэпрэсаваных беларусаў. Таму ўладальнікаў сайта, калі яны маюць намер далей працягваць яго напаўненне, чакае вялікая праца.

Сярод тых, каго згадваюць сябры культурна-асветнага клуба, ёсць і Ларыса Геніюш, чыё імя нададзена бягучаму году. Праўда, на яе старонцы не месціцца вялікі тэкст пра жыццё і дзейнасць паэткі, але цікаўны карыстальнік можа пазнаёміцца з кароткім біяграфічным расповедам, пабачыць адчаканены ў гонар Геніюш медаль, а таксама помнік каля прыватнага музея Анатоля Белага ў Старых Дарогах пад Мінскам.

Але не толькі расповеды пра асобных пакутнікаў за беларушчыну размешчаны на сайце. Згадваецца там і Слуцкае паўстанне 1920-х гадоў. На адпаведнай старонцы можна пабачыць фотаздымкі яго ўдзельнікаў, праекты помнікаў у іх гонар.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Хакейныя паралелі

Даўнавата не звярталіся мы да хакейнай тэматыкі. А між тым чэмпіянаты Кантынентальнай хакейнай лігі і беларускай вышэйшай лігі набралі сапраўдны разгон. Адзіны прадстаўнік Беларусі ў КХЛ мінскае „Дынама" выступае сёлета з пераменным поспехам. Пад кіраваннем чэшскага спецыяліста Марка Сікоры „бела-блакітныя" дзіўным чынам чаргуюць серыі перамог і паразаў. Старт быў увогуле феерычным — каманда пэўны час узначальвала заходнюю канферэнцыю, потым надышоў рэзкі спад, затым зноў чарада вікторый. Цяпер „Дынама" займае пазіцыю серадняка, але, праўдападобна, цвёрда разлічвае ў бягучым сезоне трапіць у плэй-оф. Іншая рэч — колькі з таго карысці дзяржаўна-прыярытэтнай гульні? Па сутнасці беларусаў у складзе „зуброў" не так шмат, так што асаблівага імпульсу ў развіцці хакея не атрымаецца. Часцяком здзіўляе і неаб'ектыўны арбітраж — прыкладам, у апошняй сустрэчы ў Яраслаўлі дынамаўцаў проста „засудзілі". Станоўчыя моманты — устойлівая цікавасць гледачоў і ўсё ж належная рыхтоўля шэрагу гульцоў для нацыянальнай дружыны.

У адкрытым першынстве Беларусі паралельна выступаюць 10 сваіх клубаў і 2 з блізкага замежжа — кіеўскі „Сокал" з Украіны і ліепайскі „Металургс" з Латвіі. Адзначым, што ў міжсезонне спыніў сваё існаванне мінскі „Керамін" — каманда, якая пакінула значны след у кароткай гісторыі. Ужо па звыклай завядзёнцы лідарства захапіў чэмпіён апошніх гадоў — сталічнае „Юнацтва". Гэты клуб пару месяцаў таму выйграў Кубак краіны і зараз не хавае сваіх намераў на новы тытул. Мінчукі маюць удалы сплаў дасведчаных майстроў і маладосці і ўжо стварылі салідны адрыў. У спісе лепшых бамбардыраў наперадзе таксама „юнакі".

Працягвае прагрэсаваць гродзенскі „Нёман", які трымае зараз другую пазіцыю. На фоне татальнага заняпаду гульнёвага спорту ў горадзе над Нёманам поспехі гродзенскіх хлопцаў з клюшкай выглядаюць алагічна. Але толькі на першы погляд, бо каманда збірае зараз плады таго, што трэнеру Дзмітрыю Краўчанку далі крэдыт даверу, які той спраўджвае напоўніцу. Сёлета нёманцы ўмацаваліся моцным брамнікам Сяргеем Шабанавым і захавалі сваіх лідараў, у абойме знаходзіцца ўсё больш сваіх выхаванцаў. На трэцім месцы досыць сюрпрызна ідзе жлобінскі „Металург", які не мае ў складзе яркіх індывідуальнасцей, але бярэ зладжанай камандавай гульнёй. З іншых калектываў адзначым рост „Брэста" і рэзкі спад „Магілёва" (ранейшая каманда „Хімвалакно"). Не разагнаўся пакуль як след і адзін з фаварытаў мінулых гадоў — „Гомель".

Колькі слоў і пра заакіянскую НХЛ, дакладней, пра справы ў ёй беларускіх прадстаўнікоў. Рэгулярны чэмпіянат стартаваў не так даўно. Усе „нашы" клубы ўваходзяць у зону плэй-оф — „Манрэаль" Андрэя Касціцына, „Таронта" Міхаіла Грабоўскага, „Дэтройт" Руслана Салея і „Нэшвіл" Сяргея Касціцына. Найбольш здзіўляе „Таронта" — „клёнавыя лісты" пасля доўгага заняпаду нават узначальваюць свой дывізіён. Найбольш паспяхова з беларускіх легіянераў выступае зараз Касціцын-старэйшы, прытым Андрэй пераўзышоў дасягненне лепшага беларуса па выніковасці ў НХЛ — Уладзіміра Цыплакова (69 трапных стрэлаў). Цяпер на рахунку новага рэкардсмена 71 гол. Пару разоў Касціцын станавіўся першай зоркай матча і праўдападобна гэты чэмпіянат можа стаць найбольш паспяховым у яго замежнай кар'еры. Усё ў парадку і ў Грабоўскага, а вось Сяргею Касціцыну належыць замацавацца ў новым клубе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У белавежскім парку

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Дачка Галены Любавіцкай, Марлена

Наведваючы белавежскі запаведнік зуброў немагчыма не заўважыць прыдарожных ларкоў. Бальшыня турыстаў прыкідваецца, што іх не заўважае, а толькі некаторыя з іх цікавяцца прапанаваным там таварам. Пра гэтыя белавежскія прапановы ўдалося мне пагаварыць з уласніцай аднаго ларка Галенай Любавіцкай.

— Турысты спыняюцца каля запаведніка коратка, а гандляваць тут, усярэдзіне пушчы, прыходзіцца штодзённа. Ці Вы аж так любіце пушчу? Мо Вы тутэйшая?

— Я жыву ў Гайнаўцы, дзе замужам, а сям'я ў Белавежы. Люблю пушчу. Мой дзедка Мікалай Патэюк, прадзеды, жылі ўсярэдзіне пушчы, займаліся лясніцтвам.

— З якой пары маеце тут свой ларок?

— Будзе з дванаццаць гадоў.

— Якіх замежнікаў цікавіць наша прырода, адкуль прыязджае іх найбольш?

— З Італіі, Францыі, Беларусі, Літвы, Германіі...

— Беларусы маюць жа сваю Белавежскую пушчу...

— Але прыязджаюць і сюды.

— Калі тут найбольшы рух?

— Найбольш турыстаў прыязджае летам, а найменш зімою.

— Хачу спытацца, як з ходам часу змянялася прапанова: ці помніце, якімі сувенірамі гандлявалі калісь?

— Даўней было больш рамеснікаў, якія сядзелі і на месцы вырэзвалі свае вырабы, але цяпер гэта пайшло на спад. Старыя адыходзяць, а маладым не хочацца гэтым займацца.

— Ці ў Вашай сям'і нехта займаўся разьбой?

— Ніхто.

— Таму, мабыць, Вы прадаеце плюшавыя зубраняты?..

— Плюшавыя цацкі бярэм гатовыя і яны такія міленькія, асабліва для дзяцей. Гэта быццам жывёлка, але яе можна расшпіліць і атрымаецца падушачка. Гэта такая турыстычная падушачка — дзіця выспіцца, пасля такую падушку зашпіліць і ўжо мае цацку.

Але маем таксама спецыі, гарбаткі, зёлкі, напрыклад, зёлкавы „Белавежскі перац", „Пушчанскую прыправу", зёлкавыя сумесі. Тут усё без хіміі, напрыклад, „Белавежская гарбатка" прыводзіць адчуванне Белавежскай пушчы. Ёсць малінавыя, чарнічныя, сунічныя, ружавыя гарбаткі — кожны нешта тут сабе знойдзе. Ну, і траўка „Зуброўка" ў гарэлку.

Маем таксама літаратуру, турдаведнікі, прыродазнаўчыя фільмы, напрыклад, „Год у пушчы — чатыры пары года" выпушчаны Дзяржаўнымі лясамі, маем запісы птушыных галасоў...

— А ці замежных турыстаў цікавіць гісторыя Белавежы?

— Найчасцей аглядаюць зуброў, наведваюць „Месца моцы", а часам просяць расказаць пра нейкую падзею.

Незвычайная знаходка (ус)

9 кастрычніка ў лясным масіве ў раёне вёскі Ліпіны былі знойдзены чатыры пары апраўленых і лакіраваных аленевых рагоў. Невядома хто з'яўляецца іх уласнікам (або ўласнікамі) гэтай незвычайнай знаходкі і як яна апынулася ў лесе. Павятовая камендатура паліцыі ў Гайнаўцы просіць усіх, каму нешта вядома ў гэтай справе, пазваніць на нумар 997 (сотавы 112) або паведаміць бліжэйшы пастарунак паліцыі.

Аб адным чытачы „Нівы" М. Ц.

Прачытаных нумароў „Нівы" не выкідаю, толькі зберагаю, каб пасля завезці іх у ваколіцу Сакоў, для пражываючых там сяброў. Вельмі люблю той момант, калі пасля прывітальных адбымкаў гаспадар бярэ ў мяне газеты і на нейкі час выключаецца з агульнага радаснага гоману. Ідзе ён тады на кухню і там з „Нівай" у руках сядае на тапчан. Сартуе паасобныя нумары па датах, разглядае першыя старонкі, а пасля ўсю пачку газет дзесьці хавае. Пасля з усмешкай вяртаецца да гасцей, яшчэ раз дзякуе мне і завярае, што цяпер у яго няма свабоднага часу, але ў вольныя хвіліны будзе чытаць прывезеную яму „Ніву". І чытае!

Гэты рытуал паўтараецца некалькі разоў у год. Вельмі люблю гэты момант, паколькі наглядна бачу, што раблю гэтаму зморанаму чалавеку прыемнасць. А калі некаму друкаванае слова дае радасць, то лічу яго сваім братам і прыяцелем, нягледзячы на тое, хто ён па прафесіі і адукацыі...

Адгаданка



1. заключная частка мастацкага твора, 2. ваеннаслужачы грэнадзёрскага палка, 3. Клемент, брытанскі прэм'ер-міністр у 1945-51 гг., 4. французскі дыван ручной работы, 5. дзяржава з Браціславай, 6. нагрудны знак праваслаўных архірэяў, 7. горад у штаце Арэгон на поўдзень ад Сэйлема, 8. раздзел Карана, 9. падстаўка для прыбора, 10. жыхар Стакгольма, 11. горад Сакрата Яновіча.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Аскара Уайльда. (ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 40 нумара

База, Быхаў, вочы, кайназой, кат, лімон, лыжка, мільён, снежань, Ула, цешча, Чыжы, Юлій.

Рашэнне: **Мужчына можа быць шчаслівы з любой жанчынай, але толькі калі ў ёй не закаханы.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Агнешцы Чапко** з Сямятычаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

31.10 — 06.11

(22.03. — 20.04.) Схочацца спазнаць новае і паэксперыментаваць. Услухайся ў сваю інтуіцыю. Выплывуць нявырашаныя пытанні; разбярыся з імі, бо будуць мець вялікі ўплыў на тваё далейшае жыццё. Напружаныя дні: 3 і 4.11.

(21.04. — 21.05.) Вязучы ўвесь месяц. Даведаешся многа аб сабе. Тыповыя Быкі стануць смелымі і рашучымі, нават адчайнымі. Пазбягай неапраўданай рызыкі.. Выканай усю работу, якую адкладваў на пасля. Удалыя дні: 1, 2.11., напружаныя: 5, 6.11.

(22.05. — 22.06.) Актыўнасць у асабістым плане. Твая персона ў цэнтры падзей. Магчымасць кардынальна памяняць сваё жыццё; сур'ёзныя заданні. Будзеш часцей праяўляць ініцыятыву. Схільнасць да высвятлення спраў, што можа кончыцца спрэчкамі і канфліктамі. Старайся тушыць сваю агрэсію. Сустрэчы з былымі; але наўрад ці гэта працягнецца. Удалыя дні: 1, 7.11., цяжэйшыя: 3, 4.11.

(23.06. — 23.07.) Якія цёплыя адносіны зорак да цябе! Прыемныя сюрпрызы ад лёсу. Зробленае будзе аплачана. Актыўнасць на працы. Нявыключаныя канфлікты з супрацоўнікамі. Больш варушыся. Удалыя дні: 5, 6.11., напружаныя: 3, 4.11.

(24.07. — 23.08.) Пераглядзі планы і вылучы з іх самыя неабходныя і магчымыя да рэалізацыі мэты. Будзь бліжэй да рэальнасці. Больш актыўнасці праяві ў асабістым плане; многа рамантыкі. Удалыя выступленні Львоў-спартсменаў. Напружаныя дні: 5 і 6.11.

(24.08. — 23.09.) Спакойны лістапад. Магчымасці памудрэць. Больш актыўнасці ў хатніх справах, асабліва патрабуючых сілы і энергіі. Будзь вельмі асцярожным пры пакупках, асабліва дарагога адзення і будматэрыялаў (важныя перанясі на апошнюю дэкаду лістапада). Добрыя дні: 1, 2.11.

(24.09. — 23.10.) Магчымыя клопаты ў асабістым і працоўным жыцці; хтосьці схоча зацьміць цябе сваёй прысутнасцю. Будзеш мець магчымасць разгледзець прапановы, якія могуць моцна змяніць тваё жыццё. Многа падарожжаў; удалых, калі не будзеш паспешлівым. Будзеш часам лішне адкрытым і гаваркім. Не рэкамендуецца мяняць імідж, займацца касметычнымі сур'ёзнымі працэдурамі. Добрыя дні: 3, 4.11.

(24.10. — 22.11.) Высокая актыўнасць у фінансавых пытаннях. Можаш актыўна, плённа працаваць і зарабляць; прытым траціць грошы не менш энергічна! Успаміны з мінулага, асабліва кранаючыя былое або няздзейсненае каханне. Удалыя дні: 5, 6.11.

(23.11. — 22.12.) Можаш дабіцца прафесійных поспехаў і заваяваць аб'ект сваёй жарсці. Не праяўляй спешкі і не ідзі на рызыку зачаста. Галоўны прынцып: ніякіх сумненняў адносна самога сабе! Пільнуйся пры карыстанні электрапрыладамі. Напружаныя дні: 1 і 2.11.

(23.12. — 20.01.) Наступіць час вялікага старту. Поспех чакае цябе ў любых пачатках у прафесійным плане і ў асабістым жыцці. Абдумай мінулыя мэты і жаданні, каб дапрацаваць іх. Не забывайся аб старых сябрах. Добрыя дні: 1, 2.11., напружаныя: 3, 4.11.

(21.01. — 19.02.) Многа энергіі для рэалізацыі асабістых планаў і ідэй; можаш сабраць для іх здзяйснення цэлую каманду аднадумцаў; могуць апынуцца сярод іх новыя сябры, асабліва супрацьлеглага полу. Наступяць пазітыўныя змены, нават насуперак цябе. Прыдадуцца твае веды і вопыт. Давярай унутранаму голасу і парадам праверaных сяброў. Добрыя дні: 3, 4.11., напружаныя: 5, 6.11.

(20.02. — 21.03.) Будзеш актыўны і напорысты ў здабыванні сваіх мэт. Прытым старайся не лезці ў канфлікты, асабліва з уплывовымі людзьмі. Сустрэчы з людзьмі, здаўна вядомымі. Адчуеш больш гармоніі і цяпла ў інтымных стасунках. Лёсаноснага моманту можаш сам не прыкмеціць, заняты сваім старым вялікім планам. Удалыя дні: 5, 6.11., напружаныя: 1, 2.11.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

ДОБРАЯ РАБОТА І НЕАХВОТА Ў ОРЛІ!

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

— Гэта вы? — спытала я, пераступаючы парог школьнай канцылярыі ў Орлі.

— Так, гэта я, — усміхнулася Хрысціна Куколка.

Заўсёды інтрыгаваў мяне гэты голас. Асоба, якая падымала трубку, натуральна адказвала па-свойму, заўсёды знаходзіла патрэбныя мне асобы або інфармацыі. Сёння таксама, цягам цэлага дня, разам з настаўніцай Марысяй Тамчук будуць суправаджаць мяне па аграмадным будынку школы, які сам па сабе ўяўляе найбольшае *прадпрыемства* ў гміне. Тут працуе 28 настаўнікаў, двух канцылярскіх працаўнікоў (зараз дапамагаюць ім яшчэ дзве стажоркі), тры прыбіральшчыцы, *возьны*, тры кухаркі (і адна стажорка), трох качагараў (сезонныя працаўнікі) і 204 вучняў ва ўзросце ад чатырох да шаснаццаці гадоў. У школе працуюць гмінная бібліятэка і публічная стаматалагічная амбулаторыя.

Нягледзячы на адкрытасць у бок грамадства, школа ў Орлі ўспрымаецца як недасяжная элітная ўстанова. Яе прэстыж будуюць найперш праекты і поспехі ў агульнапольскіх конкурсах і спаборніцтвах, свае выданні, выставы і сустрэчы з цікавымі людзьмі. Пра дзейнасць настаўнікаў нават канкурэнцыя гаворыць з прызнаннем:

— *Добру работу робяць*, — пачуем пасля ў Гмінным асяродку культуры.

* * *

Год таму, калі падляшскі маршалак уручаў стыпендыі таленавітай моладзі, увазе публікі быў прапанаваны фільм арлянскіх гімназістаў пад загалоўкам *І асталася толькі сінагога*. Героі фільма размаўлялі на арлянскім дыялекце, а іх гутарку тлумачылі цітры на польскай мове. Для стыпендыятаў, якія раней не сутыкнуліся з беларускай стыхіяй, плён арлянскіх гімназістаў паказаўся жывым і арыгінальным прыкладам шматкультурнасці Падляшша. Мне самой было прыемна думаць пра настаўнікаў, якія без комплексаў непаўнацэннасці навучаюць дзяцей адкрыта глядзець на сваю няпольскую культурную спадчыну.

— Мы засяродзіліся на рэгіянальных каштоўнасцях, — кажа дырэктар Дарыюш Гарадэцкі. — Большасць праектаў і мерапрыемстваў датычыць мясцовых людзей, асяроддзя.

— Widzę to jak wielki skarb, — дадае, — a to co robimy przekłada się na mentalność. Dzieciaki stają się bardziej otwarte, próbują zadawać pytania.

Школа супрацоўнічае з многімі грамадскімі арганізацыямі (між іншым з Саюзам украінцаў Падляшша) і Гміным асяродкам культуры. Гонарам школы з'яўляецца фільмавы гурток. Гімназісты, напрыклад Аскар Цюлькевіч, Эрвін Цюлькевіч, Юстына Бяроза, Анна Кубаеўская заваявалі першыя і другія ўзнагароды на фільмавых фестывалях у краіне. Прытым, дзякуючы фільмам, якія здымае і апрацоўвае моладзь, школа ўмела прэзентуе сябе не толькі ў гміне і ваяводстве, але і ў Польшчы. Рэгіянальны гурток збірае і фіксуе мясцовыя тапанімы, абрады, складае слоўнікі мясцовага дыялекту.

Хрысціна Куколка (справа) афармляе справы Алы Зянкевіч

— Як гэта магчыма? — пытаю ў спадара Гарадэцкага. — Такой праграмай не можа пахваліцца нават Універсітэт у Беластоку.

У адказ мой субяседнік дыпламатычна разводзіць рукі:

— Przecież trzeba coś robić! — кажа.

Дзейнасць рэгіянальнага гуртка гэта ў многім вынік добрага супрацоўніцтва і ангажаванасці настаўнікаў. Разам з дырэктарам праекты і заняткі вядуць настаўнікі Міраслава Раманюк, Анна Баршчэўская, Галіна Рошчанка, Беата Гарадэцкая, Альжбета Цюлькевіч.

* * *

На перапынку, паміж візітамі на ўроках беларускай мовы, гутарым з Марыяй Саевіч — настаўніцай беларускай і рускай моў з 29-гадовым стажам працы.

— Найлепш успамінаю гады ў Малінніках, — кажа настаўніца. — Там усе вучні хадзілі на беларускую мову. Зараз у Орлі толькі палова школьнікаў запісалася на беларускую мову (у час апошняга перапісу насельніцтва 68,93% жыхароў гміны назвала сябе беларусамі).

Паводле слоў настаўніц беларускай мовы, вінаватыя найперш бацькі, якія самі не вывучалі беларускай мовы. Пра дапамогу ці фінансавую падтрымку з іх боку няма што і гаварыць...

Пытаю пра дадатковыя формы дзеянняў.

— Прымаем удзел у прадметных і дэкламатарскіх конкурсах, — кажа настаўніца.

Дзень да нашай сустрэчы навучэнцы беларускай мовы ездзілі ў Бельск на „Паэтычнае трохгалоссе". Мерапрыемства пакінула прыгнятальны адбітак, бо ўсе вярнуліся без узнагарод.

У Орлі аж тры настаўнікі выкладаюць беларускую мову. (Нядаўна адышла ў водпуск спадарыня Ірына Нявінская; яе ад лістапада заменіць Марыя Лемеш). Прытым кожная з настаўніц беларускай мовы выкладае яшчэ рускую мову або інфарматыку. Пры такой разбітасці ды даездах школьнікаў і настаўнікаў складана засяродзіцца на дадатковай працы, без якой навучанне беларускай мове не праб'ецца сярод сучаснай і мультымедыйнай рэгіянальнай адукацыі.

З другога боку захапіў мяне энтузіязм і адкрытасць на беларускую мову сярод саміх дзяцей у чацвёртым ды пятым класах. Іх успамін грэў мяне ў зваротнай дарозе.

* * *

Паколькі ў Орлі вучацца дзеці з усёй гміны, школа арганізуе абеды і пачастункі. Ужо на першым перапынку класы I-III ядуць садавіну і гародніну. Дармовым пачастункам карыстаюцца ўсе малодшыя дзеці.

— А чаму тут няма старэйшых дзяцей і гімназістаў? — пацікавіліся мы.

— Бо пад праграму „Садавіна ў школе" падключаны толькі дзеці з наймалодшых класаў, — кажа Хрысціна Куколка.

Інакш выглядае справа з харчаваннем. Практычна ўсе ахвотныя могуць карыстацца школьнай сталовай. Аб тым, як арлянскія кухаркі добра гатуюць, сведчыць выказванне аднаго з вучняў для Галерэі „Зоркі", які сярод сваіх улюбёных страў назваў школьныя варэнікі з малінамі. Але не ўсе цэняць сэрца і працу кухарак. Для 81 вучня харчаванне спансаруе Гмінны асяродак дапамогі. (Таксама 43 асобы атрымалі сацыяльныя стыпендыі, а 30 асобам былі дафінансаваныя падручнікі).

— Людзі прывыклі да дарэмшчыны і гэтага зусім не цэняць, — наракае адна настаўніца. — Тыя дзеці, якія маюць дармовыя абеды, дык палову яды пакідаюць на талерцы. Ім нішто не смакуе! Таксама цяжка падпісацца ім на „Ніву". Як гэта кажуць, яду даюць дарма, а тут за беларускую газету яшчэ ім плаці... Такія пірагі.

З-за апошняй неахвоты мне цяжка было вяртацца з Орлі. Беларуская мова таксама ў параўнанні з рэгіянальным гуртком выглядала, далікатна кажучы, бледна і сапхнутай у бок малаістотных конкурсаў.

ISSN 0546-1960